

ЯК ПЕРАМАГЧЫ ТРЫВОГУ? **8**



ПРА ШТО РАСКАЖА ГІСТАРЫЧНЫ СЛОЎНІК **10**

8 КРАСАВІКА 2020 г.
СЕРАДА
№ 68 (29182)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

З першых вуснаў

Учора Прэзідэнт правёў дзве нарады, якія датычыліся найважнейшых сфер жыцця як краіны ў цэлым, так і кожнага яе жыхара паасобку, — аховы здароўя і эканомікі.

# «МЫ ПАВІННЫ ЗМАГАЦЦА ЗА КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА»

## Прэзідэнту далажылі аб гатоўнасці сістэмы аховы здароўя да пагрозы распаўсюджвання інфекцыі, выкліканай каранавірусам

**Учора ў рабочай рэзідэнцыі Прэзідэнта размова ішла аб пандэміі новай каранавіруснай інфекцыі і наступствах, якія яна можа выклікаць. Прэзідэнт папярэдзіў: прадказаць, што адбудзецца са светам пасля хваробы, не ў стане ніхто.**



Фота БелТА.

«Мы не ведаем задумы лідараў буйных дзяржаў, як яны скарыстаюцца гэтай сітуацыяй. З гісторыі мы ведаем, што кожны карыстаецца сітуацыяй так, як лічыць патрэбным і выгадным для сябе», — у доказ лідар Беларусі прывёў Другую сусветную вайну, на якой некаторыя нажыліся.

Аляксандр Лукашэнка паўтарыў сваё меркаванне, якое выказваў раней: вірусы прыходзяць і сыходзяць, і беларускія медыкі дасведчаныя ў барацьбе з імі.

«Мы не мусім мірыцца з тым, што гінуць людзі, мы павінны змагацца за кожнага чалавека. За кожнага, асабліва калі гутарка ідзе пра старых. Калі мы жадаем, ***каб потым нашы дзеці нас абаранялі і змагаліся за нашы жыцці, мы павінны змагацца за жыццё кожнага старога»,*** — запатрабаваў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што новы каранавірус, на жаль, б'е перш за ўсё па сталых і тых, у каго слабы імунітэт. Па кожным памерлым Аляксандру Лукашэнку дакладваюць — і ва ўсіх дыягназах назіраецца цэлы букет хвароб.

### Здароўе і грошы

Церпяць ад каранавіруса не толькі людзі. Пагражае хвароба і эканоміцы.

«Месяц таму сказаў, што мы хутка сутыкнёмся твар у твар з праблемамі ў эканоміцы. Сёння не я ўжо гэта кажу, сёння гавораць ва ўсім свеце: ***калі заўтра не выйдзем на работу, памрэ больш людзей, чым ад каранавіруса.*** У нас, канешне, так не будзе, таму што ў нас яшчэ сацыяльная эканоміка», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Да таго ж у адрозненне ад краін, дзе атрыманне лячэння залежыць ад медыцынскай страхоўкі, у Беларусі змагаюцца за кожнага. ***«Мы з вамі цэнім здароўе кожнага больш, чым той кожны сам сваё здароўе.*** І ў гэтым таксама наша праблема», — працягнуў кіраўнік дзяржавы.

Ён нагадаў, як уласным прыкладам прыцягвае грамадзян да здаровага спосабу жыцця. А вірус у пэўнай ступені станоўча паўплываў як на кожнага паасобку, так і на сістэму ў цэлым: многія людзі пачалі ўдзяляць больш увагі асабістай гігіене, а ахова здароўя ў гэтых умовах «узварухнулася».

«Мы разумеем, што распаўсюджанне віруса набыло занадта вялікія маштабы, таму Сусветная арганізацыя (аховы здароўя. — **«Зв.»**) аб'явіла пандэмію. Я не стану ацэньваць рашэнне СААЗ, я не спецыяліст... І потым, якая розніца: ***эпідэмія гэта, пандэмія і гэтак далей — нам усё роўна з гэтай заразай трэба змагацца»,*** — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, колькасць выпадкаў захворвання ў Беларусі расце, але не лавінападобна. Па стане на сёмага красавіка шпіталізаваны з каранавірусам 794 чалавекі, 31 — на ШВЛ.

«Пакуль сістэма аховы здароўя з гэтым спраўляецца. На апаратах ШВЛ у нас сёння 31 чалавек, а гэта ў пнеўманіі самыя цяжкія людзі. Таму дай бог, каб было так, як сёння. Тады мы і людзей выратуем, і пройдзем годна гэты перыяд», — звярнуўся да ўдзельнікаў нарады лідар краіны.

Медыцынскім работнікам Аляксандр Лукашэнка параіў не звяртаць увагі на тое, што пішуць, бо паніка і хваляванні за прачытанае толькі павялічваюць праблемы.

«Наша тактыка першапачаткова была — не фронтам ісці і наступаць. І гэта не таму, што так мне захацелася. Скажу шчыра, міністр аховы здароўя часамі мне казаў: давайце фронтам. ***А фронтам не атрымаецца. Таму што мы ў іншай сітуацыі, і рэсурсы ў нас іншыя»,*** — Прэзідэнт параўнаў Беларусь з Кітаем і Расіяй.

Аляксандр Лукашэнка зноў катэгарычна выказаўся супраць увядзення каранціну і каменданцкай гадзіны, а таксама нагадаў аб неабходнасці свежага паветра, якое заўсёды рэкамендавалася для лячэння рэспіраторных інфекцый.

### Задача — лячыць

У Беларусі працягваецца ачаговая барацьба з каранавірусам. Гэта дае вынік і ў плане здароўя, і ў плане эканомікі, упэўнены Прэзідэнт. Але кожны мусіць займацца сваёй справай, падкрэсліў ён.

«Вы павінны лячыць людзей. Усё. І калі трэба супакоіць грамадства — расказваць людзям, як вы гэта робіце. Ваша задача — лячыць людзей. Не вашы функцыі адкрываць кагосьці, закрываць, арыштоўваць і гэтак далей. У нас ёсць каму гэтым займацца. Я хварэю гэтай праблемай — не вірусам, а праблемай. У любы час мы прымем рашэнне», — звярнуўся да медыкаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка штодня па даручэнні кіраўніка дзяржавы дакладвае яму аб дынаміцы захворванняў на каранавірус. Прааналізаваўшы інфармацыю, Аляксандр Лукашэнка загадаў не трымаць у бальніцах людзей з адмоўным вынікам тэсту, арганізоўваць для такіх пацыентаў самаізаляцыю ў дамашніх умовах.

«Можам узмацніць жорсткасць (патрабаванняў да самаізаляцыі. — **«Зв.»**) так, што ў вачах пацямнее. Цябе адпусцілі дамоў з бальніцы, усе ж жадаюць хутчэй адтуль выйсці — добра. ***Але тыдзень, тры, пяць ты мусіш сядзець дома.*** Трэба — давайце ўзмацнім», — выказаў гатоўнасць кіраўнік краіны, высока ацаніўшы адказнасць, якую беларусы і так дэманструюць.

На думку Прэзідэнта, ***дзяржава нічога не забараняе, бо чалавек мае права распараджацца сваім жыццём сам, але кожнаму дапаможа абараніцца.***

### Аб'ядначца і вытрымаць

Прэзідэнт падзякаваў валанцёрскім арганізацыям за дапамогу, адзначыўшы, што і самі старыя людзі не ствараюць праблем для медыкаў.

«Я зразумеў наш ***недахоп у тым, што мы не падключылі вертыкаль улады для дапамогі вам.*** Гэта ж не справа, што дзесьці ў аптэцы няма масак, у прыватных аптэках, дзесьці ва ўрачоў чагосьці не хапае: рэспіратараў, пальчатак, акуляраў ці бахіл. Нядаўна былі такія выпадкі. Мы кожны дзень гэту сітуацыю маніторым», — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Жывí і квітней, Беларусь! Абеліскі параненай зямлі. Адраджэнне

# ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ

## Шмат помнікаў ахвярам вайны стаіць у нашых лясах. Іх даглядаюць мясцовыя жыхары, леснікі, сельвыканкамы

**Месяцы са два таму ў вёсцы Павіцце Кобрынскага раёна расказалі гісторыю, якая вельмі кранула. Адзін падарожнік, які аказаўся расійскім бізнесменам, убачыў у лесе помнік. Яго так уразіла, што сціплы абеліск за пяць кіламетраў ад населенага пункта не закінуты і не зарослы бур'яном, а дагледжаны і добраўпарадкаваны, што выпадковы госць захацеў неяк адзначыць гэтых людзей. У выніку сельскі Дом культуры атрымаў спонсарскую дапамогу на новае ўбранне сцэны. Тое, што для нас выглядае паўсядзённым і натуральным, на староннi погляд здалося асаблівым.**

### Сціплыя абеліскі

Такім помнікам, што стаяць часта нават у глыбіні лясоў, дакладна, мусіць, ніхто не ведае лік. Сярод іх сустракаюцца цікавыя аўтарскія работы, шмат тыповых савецкіх манументаў другой паловы XX стагоддзя, але найбольш простых, прымітыўных, якія нярэдка ўстанаўлівалі самі жыхары. Ды за кожным з іх — свая гісторыя, трагедыя, свае ахвяры. Тыя з помнікаў, якія даводзілася бачыць аўтару гэтых радкоў у розныя гады, выклікаюць пэўны гонар за суайчыннікаў, бо людзі не пакідаюць разбурацца знакі памяці, не забываюць прыходзіць да іх, даглядаюць, падтрымліваюць.

Вось, напрыклад, сціпленькі невялічкі помнік за вёскай Субаты Маларыцкага раёна. Яго многія і многія гады даглядала жыхарка гэтай вёскі Надзея Вакульская. Пра яе аўтару гэтых радкоў расказала Вольга Букач:

— Надзя, пакуль жыла, хадзіла туды. Ногі ўжо балелі, але ўсё роўна хадзіла. Там амаль палова яе сям'і пахаваная.

Ад Надзеі Іосіфаўны і ведалі землякі гісторыю той фашысцкай «прафілактыкі». Вёска Субаты знаходзіцца ў лесе, такіх жыхароў заўсёды падазравалі ў сувязі з партызанамі. А праверыць вырашылі асаблівым чынам. Прыехаў карны атрад. Выводзілі з кожнай хаты сям'ю і звяралі наяўных яе членаў са спісам. Калі дома не аказвалася кагосьці з мужчын, аўтаматычна лічылася, што ён ваюе ў рэгулярнай арміі альбо ў партызанскім атрадзе. Такую сям'ю выводзілі ў лес амаль за кіламетр ад вёскі і забівалі, у тым ліку старых і малых... Помнік на тым месцы паставілі вельмі даўно. Пазней прымацавалі мемарыяльную таблічку.

На вялікай брацкай магіле растуць шматгадовыя кветкі. Іх пасадзіла яшчэ Надзея Вакульская. Але яе няма ўжо тры гады, і помнік даглядае Чарнянскі сельскі Савет. Агароджа блішчыць свежай фарбай, вакол чысценька.

Адсюль да кобрынскай вёскі Ор напрасткі ўсяго кіламетраў дзесяць. Ва ўрочышчы Ор у глыбіні лесу таксама ўстаноўлены помнік на брацкай магіле. Мяркуючы па таблічцы, тут пахаваныя афіцэры, салдаты, партызаны, якія загінулі ў 44-м пры вызваленні. Але ж мясцовыя жыхары расказвалі, што пахаванні пачаліся яшчэ летам 41-га, калі ў вёску толькі зайшлі немцы. Акупанты знайшлі некалькі чырвонаармейцаў, якія не паспелі за часцю, і расстралялі. Потым тут хавалі партызан, якія гінулі ў перастрэлках у 1942—1943 гадах. А ў сакавіку 44-га былі асабліва жорсткія баі. Страты неслі абодва бакі. Немцы таксама хавалі сваіх, а ў іх яшчэ ваявалі мадзьяры, румыны, харваты. Потым, пасля раставання снегу, мясцовыя жыхары знаходзілі трупы людзей і асабліва не разбіралі, свой ці чужы, — закопвалі на месцы. Ведалі: Богам залічыцца.

І ўжо пасля вайны правялі перапахаванне. Дзе помнілі — адкопвалі, звозілі ўсіх у адно месца, хавалі. Яшчэ пазней паставілі абеліск. Яго даглядала не адно пакаленне школьнікаў. Цяпер помнік і прылеглую тэрыторыю падтрымліваюць у парадку сельскі Савет і лясніцтва.

СТАР. 5

# «АПАРТАМЕНТЫ» З ВІДЭАНАЗІРАННЕМ



Жыхар вёскі Хаценчыцы Вілейскага раёна Віктар КАЗЛОЎСКІ вядомы як знаўца прыроды і паспяховы фатограф фаўны і флоры, адзін з заснавальнікаў беларускага клуба фатографаў дзікай прыроды і цяперашні старшыня гэтай установы. Чытачы часопіса «Родная прырода» ведаюць Віктара як аўтара цікавых «партрэтаў» птушак і жывёл, якія часта друкуюцца на старонках выдання. А яшчэ Віктар Іосіфавіч здымае відэафільмы пра нашы заказнікі і нават пра нацыянальны парк. Ён любіць падглядваць у братоў нашых меншых незвычайныя сюжэты. На падворку Віктара Казлоўскага цяпер знаходзіцца некалькі самаробных дуплянак для птушак, асабліва для качак, якія гняздуюцца і выводзяць сваё патомства менавіта ў дуплах; крохаляў і гогаляў. У птушыных хатках Віктар будзе маскіраваць відэакамеру, каб быць у курсе ўсіх птушыных сакрэтаў. Днямі разам з фотаклубаўцамі ён развесіць дуплянкі на дрэвах побач з вадаёмамі, каб пачаць здымаць новы цыкл пра невядомыя старонкі жывой прыроды.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША заявілі аб сваім праве на рэсурсы Месяца



Адпаведны ўказ падпісаў амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп. Пра гэта паведаміла прэс-служба Белага дома. У дакуменце сказана, што амерыканцы павінны мець права весці камерцыйныя даследаванні, здабычу і выкарыстанне рэсурсаў у касмічнай прасторы ў адпаведнасці з заканадаўствам. Аднак ва ўказе адзначаецца, што космас юрыдычна і фізічна з'яўляецца ўнікальнай прасторай для дзейнасці чалавека і ЗША не разглядаюць яго ў якасці ўсеагульнага здабытку. Такім чынам, палітыка краіны будзе накіравана на стымуляванне міжнароднай падтрымкі па здабычы і выкарыстанні рэсурсаў у космасе. У прыватнасці, ЗША не прызнаюць Пагадненне аб дзейнасці дзяржаў на Месяцы і іншых нябесных целах, удакладняецца ў дакуменце.

### Брытанскі суд прыняў бок аўтаўладальнікаў па справе аб «дызельгейце»

Высокі суд Лондана вынес рашэнне на карысць каля 90 тысяч брытанскіх аўтаўладальнікаў па калектыўным іску да нямецкага аўтаканцэрна Volkswagen аб махінацыях з праграмным забеспячэннем. Пра гэта паведаміла газета The Guardian. Па яе звестках, суд прызнаў, што спецыяльнае праграмнае забеспячэнне, якое дазваляла на праверках заніжаць паказчыкі шкодных выкідаў аўтамабіляў канцэрна, можна лічыць «падманнай прыладай».




«Яна зводзіць на нішто мэтазгоднасць тэста, бо робіць немагчымым яго прымяненне да рэальных дарожных умоў, як гэта прадугледжана», — прыводзіць The Guardian меркаванне суддзі.

### У Індыі выставілі на продаж найвышэйшую статую ў свеце



Індыйская паліцыя адкрыла расследаванне ў дачыненні да людзей, якія размясцілі на сайце прыватных аб'яў паведамленне аб продажы «Статуі адзінства» — самай высокай статуі ў свеце, збудаванай у індыйскім штаце Гуджарат. Па паведамленні Indian Express, аўтары выставілі цэннік 3 мільярды індыйскіх рупій (каля $39,5 млн), аднак пазней адміністрацыя сайта выдаліла скандальную аб'яву. Indian Express адзначае, што расследаванне адкрыта па фактах «публікацыі і распаўсюджвання чутак, а таксама фальсіфікацыі». Аўтараў аб'явы шукаюць. Як вядома, «Статуя адзінства» была адкрыта 31 кастрычніка 2018 года. З тых часоў яна стала адной з турыстычных славутасцяў індыйскага штата Гуджарат. Яе вышыня разам з пастаментам складае 240 метраў.

ISSN 1990 - 763X
20068>
9 771990 763008

### КОРАТКА

• **«Белнафтахім» чакае ў найбліжэйшы час танкер з 85 тысячамі тон нафты з Азербайджана.**

• Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архібіскуп Тадэвуш Кандрусевіч заклікае каталікоў адсвяткаваць Вялікдзень дома.

• **Электрамабілі да 2030 года могуць замяніць каля 20 % звычайнага транспарту ў свеце.**

• Беларускія навукоўцы распрацавалі разумную паперу, якая падаўжае тэрмін захоўвання харчовай прадукцыі.

• **МАРГ увёў рэгуляванне цэн на маскі і антысептыкі.**



• Падчас Тыдня лесу ў Беларусі залажылі 75 памятных алей.

• **Нацыянальная бібліятэка Беларусі прапануе чытачам віртуальныя сэрвісы.**

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Жывіце ў бяспецы!

# ЛЕСВІЦА-ПАЛКА І ЛІЧЫЛЬНІК ПАЖАРАЎ

## Карэспандэнты «Звязды» наведалі сталічны «Музей агню»

**На базе Мінскага гарадскога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях дзейнічае незвычайны Цэнтр навучання асновам жыццядзейнасці. Носіць ён назву «Музей агню». Цэнтр не толькі знаёміць з гісторыяй пажарнай службы сталіцы, але і вучыць дзяцей таму, як дзейнічаць у розных надзвычайных сітуацыях. А заадно там наглядна дэманструецца, да чаго прыводзіць бесклапотнасць.**

— Калісьці, яшчэ ў 1970-я гады, тут была арганізавана выстаўка дзіцячай творчасці і пажарнага аварыйна-выратавальнага абсталявання, — згадвае **начальнік сектара прапаганды бяспекі жыццядзейнасці цэнтра прапаганды і сацыякультурнай дзейнасці Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Ірына УЛАСЕВІЧ.** — Але да 160-годдзя пажарнай службы, якое адзначалася ў 2013 годзе, наш «Музей агню» перажыў рэканструкцыю і папоўніўся вельмі цікавымі экспанатамі.

Музей карыстаецца вялікай папулярнасцю ў сталічных школьнікаў. За год іх праходзіць праз дзве залы некалькі тысяч.

— Толькі ўявіце сабе лічбу: у 1986 годзе ў пажарах на тэрыторыі тагачаснай БССР загінуў 101 малы! Гэта чатыры звычайныя класы. А летась гэтая колькасць зменшылася роўна ў 101 раз. Пэўна, ёсць у гэтым і наш унёсак. Мы не стараемся штосьці хаваць, а наадварот, паказваем вельмі рэалістычныя рэчы, якія адвучваюць забаўляцца з агнём.

СТАР. 3



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# «МЫ ПАВІННЫ ЗМАГАЦЦА ЗА КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У бальніцу накіраваны і ваенныя медыкі, не з-за таго, што грамадзянскія спецыялісты не спраўляюцца, а каб яны, па-першае, навучыліся працаваць у такіх выпадках, па-другое, ваенныя — крыніца інфармацыі для кіраўніка краіны.

«Я папярэдзіў прэм'ер-міністра і ўрад: калі толькі да канца тыдня адказныя людзі мне даложаць, што чагосьці не хапае дзесьці — у магазінах, аптэках, бальніцах, асабліва для аховы ўрачоў, — урада не будзе. Будуць працаваць іншыя», — папярэдзіў лідар дзяржавы.

Камітэту дзяржаўнага кантролю пастаўлена задача прадухіліць нажыванне на праблемах. «Не трэба мне казаць, што цэны падняліся на імбір, лімоны, часнок і цыбулю. Слухайце, цыбулі ў нас не хапае! Разбірайцеся», — абурыўся Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

**Група навуковых супрацоўнікаў пад кіраўніцтвам доктара медыцынскіх навук прафесара Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Валерыя СЯМЁНАВА *(на фота)* распрацавала тэст-сістэмы для выяўлення каранавіруса.**

## Смяротнасць знізілася

Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў, што ***ніякую інфармацыю дзяржаўныя органы не хаваюць, і папярэдзіў пра недапушчальнасць гэтага.***

«Калі вы адзін раз схлусіце, вам ніхто верыць не будзе, таму вы збірайцеся, акуратна, як кітайцы гэта паказалі, — колькі каранавірусных, колькі паступіла першага ўзроўню, колькі выпісалася, колькі ляжыць у бальніцах... Калі ёсць памерлыя, дайце гэтую інфармацыю, толькі акуратна. Таму што спачатку родныя нябожчыка распіяраць у інтэрнэце, а потым, калі мы пачынаем пералічваць захворванні гэтага чалавека, яны пачынаюць крыўдзіцца. А чаму вы крыўдзіцеся? Чаму бяжыце ў інтэрнэт, скідваеце гэту інфармацыю?» — здзівіўся Аляксандр Лукашэнка.

У краіне назіраецца спад захваральнасці на ВРВІ, але звычайна ў гэты перыяд узрастае колькасць хворых на пнеўманію. Таму Аляксандр Лукашэнка пахваліў тактыку медыкаў — звярнуць на іх асаблівую ўвагу. Ён лічыць, што справіцца з каранавірусам будзе тым лягчэй, чым далей мы пратрымаемся на тых пазіцыях, што маем.

«Жыць, вядома ж, мы будзем. Толькі ***давайце не будзем панікаваць і давайце ўсе разам будзем працаваць і ісці тым шляхам, які мы вызначылі, як бы нам ні было складана»,*** — заклікаў кіраўнік краіны.

Пры параўнанні двух першых кварталаў (мінулага года і цяперашняга) агульная смяротнасць знізілася на чатыры працэнты. Ад пнеўманіі за тры месяцы 2020 года памерла 254 чалавекі. У параўнанні перыядаў за студзень—сакавік двух гадоў па хваробах органаў дыхання смяротнасць з гэтай прычыны знізілася на 20 працэнтаў, а колькасць захворванняў на пнеўманію — на дзевяць працэнтаў.

«Шаноўныя таварышы, не забывайце, што акрамя каранавіруса, пнеўманій у нас ёсць іншыя хваробы. І вы бачыце, што там гінуць людзі ў пяць, шэсць разоў больш, чым ад пнеўманіі. Гэта не значыць, што трэба паслабіць работу па гэтай галоўнай, сусветнай праблеме. Не. Мы вызначыліся, мы як ніколі аб'ядналіся ў гэтай барацьбе, і мы павінны выстаяць. Але ***не забывайцеся, што і анкалагічных хворых мы павінны лячыць, і на сардэчна-сасудзістыя хваробы, і іншых»,*** — папрасіў Прэзідэнт. Ён справядліва заўважыў, што і ацэньваць сістэму аховы здароўя будуць з гэтай пазіцыі.

Яшчэ адна настойлівая просьба ад Прэзідэнта — ***аднесціся больш сур'ёзна да здароўя ўрачоў.***

Прэзідэнт сказаў, што калі будзе неабходна, ён сам асабіста пойдзе клапаціцца пра хворых.

«Мы павінны з вамі перамагчы прыгожа. Мы павінны выратаваць людзей годна. Кожны чалавек, які трапіў з вірусам гэтым, не павінен думаць, што ён смяротнік. Не. Усіх выратуем, каго толькі магчыма», — паабяцаў лідар краіны.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Варвара МАРОЗАВА.**

## На передавой

Інфекцыйныя бальніцы і стацыянары, дзе лечацца пацыенты з каранавірусам, абаронены лепш за астатнія, у якіх былі факты інфіцыравання медработнікаў. Пра гэта паведаміў журналістам **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.**

«Таму ўзмацняем забеспячэнне сродкамі аховы ўсіх стацыянараў, больш жорстка назіраем за выкананнем масачнага рэжыму. Наша лёгкая прамысловасць дадаткова плануе выпускаць да мільёна масак у суткі ў пачатку наступнага тыдня», — дадаў міністр.

У кожнай бальніцы на змену павінна быць у наяўнасці 50—100 касцюмаў біялагічнай аховы, з першым пацыентам забеспячэнне пачынаецца ўжо па іншых нормах. Штодня ў Беларусі выпускаецца дваццаць тысяч камбінезонаў біялагічнай аховы, і аб'ём нарошчваецца, падкрэсліў Уладзімір Каранік.

Для аказання дапамогі пацыентам з каранавірусам выдзелена больш за сем тысяч ложкаў (амаль дзесяць працэнтаў ложкавага фонду краіны). Загружана з іх — менш за трыццаць працэнтаў.

«Прыкмет перагрузкі сістэмы аховы здароўя няма», — запэўніў кіраўнік ведамства.

Ён праінфармаваў, што ўжо за сакавік медыцынскія работнікі, якія працуюць з пацыентамі з каранавіруснай інфекцыяй, атрымліваюць мэтавыя даплаты. Ва ўрадзе абмяркоўваецца пытанне павелічэння гэтых даплат.

**Намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Наталля ЖУКАВА** дадала, што для процідзеяння распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі працягваюцца пошук і лакалізацыя кантактаў, у тым ліку ўначы. Узмоцнена група, якая займаецца дэзынфекцыяй — як жылля і бальніц, так і грамадскага транспарту.


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «БЭЛЗ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-96196, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 204/1-1. Площадь – 4060,5 кв. м. Наименование: изолированное помещение. Назначение: помещение неустановленного назначения. Обременения: аренда, ипотека, безвозмездное пользование. Продавец обязуется по требованию покупателя снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации перехода прав собственности по договору купли-продажи с покупателем либо в иной срок, согласованный с покупателем. Изолированное помещение входит в состав капитального строения с инв. 100/С-46506, наименование – лабораторный корпус, площадью 6737,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029066, площадью 1,0154 га, предоставленного продавцу на праве аренды (доля 7/8). Срок действия: по 09.03.2065. На земельном участке установлены следующие ограничения: водоохранная зона реки Мухавец, площадь 1,0154 га | | | | |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **2 632 534,92** | **Задаток, BYN** | **263 253,49** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-96197, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 204/1-2. Площадь – 693,7 кв. м. Наименование: изолированное помещение. Назначение: Помещение неустановленного назначения. Обременения: запрет на отчуждение, арест, ипотека. Продавец обязуется снять запрет на отчуждение и арест до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем, а также по требованию покупателя снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации перехода прав собственности по договору купли-продажи с покупателем либо в иной срок, согласованный с покупателем. Изолированное помещение входит в состав капитального строения с инв. 100/С-46506, наименование – лабораторный корпус, площадью 6737,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029066, площадью 1,0154 га, предоставленного продавцу на праве аренды (доля 7/8). Срок действия: по 09.03.2065. На земельном участке установлены следующие ограничения: водоохранная зона реки Мухавец, площадь 1,0154 га | | | | |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **505 386,36** | **Задаток, BYN** | **50 538,64** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 3** | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-97463, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 204-2. Площадь – 5724,2 кв. м. Наименование: изолированное нежилое помещение. Назначение: Административное помещение. Обременения: аренда, ипотека, безвозмездное пользование, запрет на отчуждение, арест. Продавец обязуется снять запрет на отчуждение и арест до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем, а также по требованию покупателя снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации перехода прав собственности по договору купли-продажи с покупателем либо в иной срок, согласованный с покупателем. Изолированное помещение входит в состав капитального строения с инв. 500/С-34897, наименование – административное здание инженерного корпуса, площадью 6998,2 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029066, площадью 1,0154 га, предоставленного продавцу на праве аренды (доля 7/8). Срок действия: по 09.03.2065. На земельном участке установлены следующие ограничения: водоохранная зона реки Мухавец, площадь 1,0154 га | | | | |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **3 600 563,52** | **Задаток, BYN** | **360 056,35** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ», 220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1; тел.: 8 017 284 94 32, факс: 8 017 286 76 80 | | | | |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Брестский электроламповый завод», 224020, г. Брест, ул. Московская, 204; тел. +375 162 35 64 04, факс: +375 162 35 64 29 | | | | |
| **Сведения о представителях Продавца для осмотра/ознакомления с предметом аукциона** | Грунтова Александра Петровна, тел. +375 44 580 63 02 | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, оплата вознаграждения** | Победитель аукциона в течение 3 (трёх) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях на следующие банковские реквизиты: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240 ОКПО 37392696. Оплата задатка производится не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты на следующие банковские реквизиты: в белорусских рублях: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 08 мая 2020 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **12 мая 2020 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35, Инновационный центр «Горизонт» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения повторного аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения | | | | | |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей» | | | | | |

**Дополнительная информация по тел.: +375 17 284 94 32.**
**E-mail: arenda@horizont.bn.by**


# «ЗАДАЧА ТАКІХ КРАІН, ЯК НАША, — БЫЦЬ ГАТОВЫМІ ДА ЛЮБОГА РАЗВІЦЦЯ ПАДЗЕЙ»

## Прэзідэнт правёў нараду, прысвечаную рабоце нафтаперапрацоўчага комплексу краіны

**З пачатку 2020-га нафтавыя пытанні былі самыя актуальныя як для кіраўніцтва, так і для жыхароў Беларусі. На працягу многіх гадоў напярэдадні калядных свят з расійскім бокам (асноўным пастаўшчыком) удавалася дамаўляцца па аб'ёмах і цане. Сёлета схема дала збой, а праз некаторы час медыйны парадак захапіла ва ўсіх сэнсах «вірусная» інфармацыя. Але нават на гэтым фоне паведамленне пра тое, што ўмовы, якія падыходзяць Беларусі, узгодненыя, прагучала моцна. А ўчора «нафтавае» пытанне абмяркоўвалі на самым вышэйшым узроўні ў Палацы Незалежнасці.**

### Пытанне нумар адзін

«Няма неабходнасці характарызаваць сітуацыю, якая складваецца ў свеце, і ў тым ліку ў нашай краіне — мы не адасобленыя ад гэтых падзей. Натуральна, ***маючы асабліва адкрытую эканоміку, мы шмат у чым залежым ад тых працэсаў, якія адбываюцца ў свеце»,*** — сказаў Прэзідэнт, заўважыўшы, што падзеі часам развіваюцца неадназначна, але бурна.

Таму кіраўнічыя рашэнні патрабуюць аператыўных мер, «як кажуць у народзе — з колаў». Часу на перапіскі, развагі і ўзгадненні практычна няма.

Прэзідэнт адзначыў, што ім запланаваны шэраг мерапрыемстваў па пытаннях, якія патрабуюць найбольшай ступені рэагавання і ўплываюць на нашу эканоміку.

***«Падкрэсліваю, гэта галоўнае — эканоміка, а значыць, жыццё людзей. І не толькі сёння, але і ў перспектыве — пытанне нумар адзін.*** Усё павінна быць падпарадкавана гэтаму пытанню», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён запрасіў прысутных на размову таксама і для таго, каб атрымаць аператыўны даклад аб стане спраў у нафтаперапрацоўчым комплексе краіны. «Мы не адзін раз звярталіся сёлета і ў канцы мінулага года да гэтых праблем. Пры ўсіх праблемах нам больш-менш удалося стрымаць (негатыўныя. — **«Зв.»**) працэсы ў галіне нафтаперапрацоўкі, але і вірусная праблематыка, і каранапсіхоз, які прыйшоў за ёю, вядома, ускладнілі сітуацыю», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт абазначыў пытанні ў гэтым ключы: якую загрузку магутнасцяў і якія паказчыкі эфектыўнасці маем за справаздачны перыяд? Больш падрабязна папрасіў кіраўнік краіны спыніцца на перспектывах.

«Нафтавы рынак празмерна ліхаманіць, а яго кан'юнктура абсалютна непрагназуемая. Валацільнасць шалёная, то нафта да абеду падае ў цане, затым стабілізуецца, вяртаецца да таго ж узроўню, потым зноў падае, і невядома, што яшчэ будзе, — пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка. — ***Таму задача такіх краін, як наша, — быць гатовымі да любога развіцця падзей. А лепш, як я ўжо казаў, у найменшай ступені залежаць ад нафтавых гульняў найбуйнейшых дзяржаў».***

Па словах Прэзідэнта, тыя нават не ўтойваюць, якія мэты пераследуюць.

«Яны ўжо непасрэдна, ці не апраўдваючыся адно перад адным, пачынаюць казаць і гуляць на павышэнне цаны на нафту. Відавочна, картэльная змова», — не сумняваецца кіраўнік Беларусі.

Але паўплываць на гэта не можа ніхто. «Мы за гэтым назіраем і, давайце шчыра казаць, ***нам неабходна ў гэтай сітуацыі сарыентавацца. І прыстасаваць сваю эканоміку і грамадства, каб не панесці страт»,*** — падкрэсліў лідар дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, чым больш апор мы створым для нашай эканомікі, тым больш устойлівае будзе грамадства і незалежная — наша палітыка. Пакуль, на яго погляд, зроблена ў гэтым кірунку недастаткова.

«Праблемы, якія павінны вырашацца паміж суб'ектамі гаспадарання ў рамках нармальных дагаворных адносін (максімум з удзелам нашага канцэрна «Белнафтахім»), мы ўсё яшчэ вымушаныя разглядаць на вышэйшым узроўні. Гэта значыць, што пры ўзнікненні цяжкасцяў у поўнай меры не задзейнічаны эканоміка-вытворчы, дыпламатычны і юрыдычны патэнцыял краіны, — указаў Аляксандр Лукашэнка. — ***Калі пытанне важнае і экстраннае, то і напружвацца павінны не адзін-два чалавекі, а ўся вертыкаль. Невырашальных праблем тут няма і ў прынцыпе быць не можа».***

### Нафту на стол не падасі

У фокусе сустрэчы былі і пытанні на перспектыву: якія дасягнуты дамоўленасці па пастаўках нафты на бягучы месяц, што праглядаецца да канца года і наколькі жорсткія гэтыя планы? Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне — у самы бліжэйшы час сысці ад пастаянных спрэчак, высвятленняў і стану вечнай нявызначанасці. На непрадбачаныя выпадкі неабходна, па яго парадзе, стварыць запас сыравіны (як нафты, так і паліва). Гэта дазволіць не парушаць работу галін і не перарываць тэхналагічныя працэсы.

З гэтай прычыны, па словах кіраўніка краіны, урад, старшыні аблвыканкамаў павінны даць адказы на шэраг пытанняў — якія магутнасці для захоўвання нафты і запасаў нафтапрадуктаў ёсць сёння, як можна іх нарасціць, як забяспечана патрэба ў аўтамабільным паліве для вясновых палявых работ, дзе ёсць вузкія месцы.

«Асабліва звяртаю на гэта ўвагу. Вы бачыце ўжо, што не толькі асобныя чыноўнікі міжнародных арганізацый загаварылі аб голадзе ў недалёкай перспектыве, а ўжо і ўчарашнія самыя развітыя і перадавыя краіны, і іх кіраўнікі. ***Таму сельская гаспадарка і перш за ўсё сённяшняя пасяўная кампанія — найважнейшы элемент, на які мы павінны звярнуць увагу»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт.

Нафта нафтай, але яе на стол не падасі. ***«Пытанне харчавання, як я ўжо сказаў, стаіць востра, таму я патрабую ў самыя кароткія тэрміны завяршыць пасяўную кампанію і ўвесь цыкл сельскагаспадарчых работ на працягу года ўзяць на жорсткі кантроль,*** — паставіў мэту Прэзідэнт. — Гэта задача нумар адзін, і важней за яе няма. Як у нас разглагольствуюць вакол — каранцін, каменданцкі час і іншае. Слухайце, гэта прасцей за ўсё, гэта мы зробім на працягу сутак. Але есці што будзем?»

Прэзідэнт не хавае — нафта сёння танная, трэба яе купіць, стварыць нафтапрадукты і збіраць запас. Таму асаблівая ўвага на нарадзе — магчымасцям захавання паліва.

«Не дай бог хтосьці скажа, што ён можа прыняць паўмільёна тон нафтапрадуктаў і не прыме на захаванне, крыўдуйце самі на сябе. А яшчэ горш, калі мне Анфімаў (старшыня КДК. — **«Зв.»**) даложыць, што залілі ў бочку, а яна ў трох месцах працякае», — папярэдзіў лідар краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

**Андрэй РЫБАКОЎ, старшыня канцэрна «Белнафтахім»:**

«Як я і заяўляў раней, у нас вядзецца работа — як па альтэрнатыўных пастаўках нафты, так і па пастаўках нафты ў красавіку трубаправодным транспартам з Расійскай Федэрацыі. На гэты момант ідзе кантрактаванне па ўсіх кірунках. Фактычна заводы падымаюць свае вытворчыя перапрацоўчыя магутнасці, і як унутраны рынак, так і экспарт у красавіку будзе забяспечаны ў поўным аб'ёме».


**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о проведении 24 апреля 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»**

| **Предмет торгов** |
|---|
| «здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а 1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211 |
| Местонахождение – Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1 |
| Начальная цена – 1 790 445,60 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 179 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **24 апреля 2020 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 08.04.2020 по 22.04.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-58, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**


На слыху

# НАЙБОЛЬШАЯ КОЛЬКАСЦЬ ХВОРЫХ НА COVID-19 — У МІНСКУ

**У Беларусі праведзена каля 43 тысяч тэстаў на COVID-19. Зараз з пацверджаным дыягназам шпіталізавана 794 чалавекі, 54 паправіліся, 13 памерлі. Міністэрства аховы здароўя абнавіла статыстыку па інфіцыраваных і ўдакладніла інфармацыю аб колькасці захварэлых у рэгіёнах.**

Найгоршая сітуацыя застаецца ў Мінску. У сталіцы зараз шпіталізавана 497 чалавек, 25 паправіліся, пяцёра памерлі. На другім месцы па колькасці інфіцыраваных Віцебская вобласць. Тут у стацыянарах знаходзіцца 143 чалавекі, 27 былі выпісаны, пяцёра памерлі. У Мінскай вобласці шпіталізаваны на цяперашні момант 91 пацыент, адзін паправіўся, трое памерлі.

У астатніх рэгіёнах сітуацыя пакуль больш спакойная. У Гомельскай вобласці ў стацыянарах з пацверджаным дыягназам COVID-19 знаходзіцца 32 чалавекі, адзін выпісаны, у Магілёўскай — 18 чалавек шпіталізавана. На Гродзеншчыне 10 пацыентаў знаходзіцца ў медустановах, на Брэстчыне — трое.

У большасці пацыентаў, што знаходзяцца на стацыянарным лячэнні, захворванне працякае ў лёгкай ці сярэдняй форме. 31 пацыент мае патрэбу ў штучнай вентыляцыі лёгкіх. За апошнія суткі з медустаноў выпісана 426 чалавек, якія знаходзіліся на розных формах кантролю і лячэння.

Нагадаем, што дзень таму ў стацыянарах па ўсёй краіне знаходзілася 634 інфіцыраваных. За суткі іх колькасць павялічылася на 160 чалавек. Новых выпадкаў смерці ад каранавіруснай інфекцыі за мінулыя суткі не зарэгістравана.

**Алена КРАВЕЦ.**

Сацыяльны вектар

# Ветэраны атрымліваюць дапамогу

**Пачынаючы з 1 красавіка, амаль 16 тысяч ветэранаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама тых, хто пацярпеў ад наступстваў вайны, ужо атрымалі аднаразовую матэрыяльную дапамогу да 75-годдзя Перамогі.**

Як паведаміла прэс-служба Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, аднаразовая матэрыяльная дапамога складае:

2500 рублёў — Героям Савецкага Саюза;

1700 рублёў:

- інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, асобам, якія бралі ўдзел у баявых дзеяннях па абароне Айчыны да 3 верасня 1945 года;
- асобам, якія бралі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах;

900 рублёў — ветэранам вайны з ліку асоб:

- узнагароджаных ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны;
- якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых граніц дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог;

**Выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі будзе праводзіцца з 1 красавіка да 1 мая 2020 года.**

- якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 года да 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаны медалём «За абарону Ленінграда», узнагароджаных знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда»;

700 рублёў — грамадзянам, якія пацярпелі ад наступстваў вайны:

- членам сем'яў ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі (памерлі), зніклых без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны, а менавіта:
- сужэнцам, якія не ўступілі ў новы шлюб;
- дзецям і іншым утрыманцам загінулых (братам, сёстрам, пасынкам, падчаркам), якія маюць інваліднасць з дзяцінства;
- былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны, якім устаноўлена павышэнне пенсіі на ўказанай падставе ў адпаведнасці з заканадаўствам;
- інвалідам з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў.

Пры гэтым у Мінпрацы адзначылі, што пры наяўнасці права на атрыманне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі па некалькіх падставах дапамога аказваецца па падставе, якая прадугледжвае найбольшую выплату.

**Святлана БУСЬКО.**

**На 1 красавіка 2020 года ў Беларусі пражывала:**

- **4785 ветэранаў вайны;**
- **14 532 асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны.**

# ЛЕСВІЦА-ПАЛКА І ЛІЧЫЛЬНІК ПАЖАРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзве з паловай гадзіны, на якія разлічана экскурсія, пралятаюць вельмі хутка. І мая задача — каб малыя сышлі адсюль крыху іншымі... Паказальная рэакцыя і дарослых. Настаўнікі кажуць: яны нават і не ўяўлялі, што на пажары ўсё можа быць настолькі жудасна. І ўсе нашы экскурсіі — гэта не лекцыі. Простая начытка дзецям нецікавая. У нас пануюць дыялог і інтэрактыў, каб малыя не толькі даведаліся пра нешта новае, але і адчулі на сабе.



## Наперадзе — брандмайстар

Экспазіцыя першай залы прысвечана гісторыі пажарнай службы да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Нягледзячы на войны, дзве нямецкія і польскую акупацыю, некалькі каштоўных рарытэтаў удалося захаваць. А ў 1974-м сталічныя ратавальнікі, якія тады падпарадкоўваліся Міністэрству ўнутраных спраў, атрымалі вельмі каштоўную дыяраму, прысвечаную аднаму з самых разбуральных пажараў у гісторыі Мінска. Здарыўся ён за 60 гадоў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны — 21 чэрвеня 1881 года.

Гісторыя захавала нават час, калі пачалося бедства, — 10.30 раніцы. «Адпраўным пунктам» стаў склад, дзе захоўваліся шкіпінар і смолы. Паколькі гэтыя рэчывы гараць вельмі добра, то агонь хуценька распаўсюдзіўся і на суседнія пабудовы. І літаральна праз паўгадзіны ўжо палалі цэлыя вуліцы. Імкліваму пашырэнню агню спрыяў моцны вецер.

Канешне, у той час у Мінску дзейнічала пажарная часць, было і Вольнае пажарнае таварыства. Але ў іх не было той тэхнікі, якая адпраўляецца на баявыя выезды ў нашы дні. Усё, што мелі ў сваім арсенале пажарныя XIX стагоддзя, — гэта бочкі на 400 літраў і ручныя помпы. Вада выпаралася ад страшнага жару яшчэ далёка ад агню. Ды і даставіць яе была тая яшчэ задача: коні палохаліся полымя і не маглі пад'ехаць блізка, рэзка кідаліся ў бакі. Пад пагрозай калецтва былі і людзі побач. Таму пажарныя вельмі шмат часу змарнавалі на тое, каб уратаваць хоць свой няхітры скарб, каб ён не загінуў пад капытамі напалоханых жывёл.



Агулам пажар бушаваў два дні. У попел і руіны ператварылася больш за 250 дамоў, 270 крам, склады і нават урадавыя ўстановы. Без даху над галавой засталося больш за дзве тысячы сем'яў. Часова іх размясцілі ў казармах на ўскраіне горада, але калі войскі вярнуліся з чарговых манёўраў, гэты прытулак давялося пакінуць. Зрэшты, як і горад — месца для пагарэльцаў у ім не знайшлося. А наперадзе была зіма...

— Гэты пажар падштурхнуў улады горада да пабудовы першага пажарнага дэпо, — кажа Ірына Уласевіч. — Яго будынак ацалеў — прыгожы трохпавярховы дом з чырвонай цэглы ўпрыгожвае вуліцу Гарадскі Вал. Стыхія паўплывала і на горадабудаўнічую палітыку. У цэнтральнай частцы горада было строга забаронена ўзводзіць драўляныя дамы — менавіта таму будынкі, якія дайшлі да нашых часоў, складзены з цэглы. Тады ж мінскія пажарныя закупілі і трохколенныя лесвіцы. Для таго каб выбіць акно, выкарыстоўвалася штурмоўка з круком. Але ўсё ж большую частку забудовы Мінска складалі аднапавярховыя прыватныя дамы. На іх дах ратавальнікі ўзлазілі пры дапамозе складной лесвіцы-палкі. Яна ёсць на ўзбраенні агняборцаў і цяпер. А пабачыць адзін такі экземпляр можна якраз у музеі.

Яшчэ адзін цікавы экспанат — ікона «Неапалімая Купіна». Раней яна была нязменным атрыбутам ледзь не кожнага дома. Лічылася, што такі абраз абараняе жытло ад агню. На гэтай іконе адлюстравана зорка з васьмю канцамі. Напрыканцы 1990-х гадоў яе змясцілі на эмблему выдзеленага са складу МУС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Застаецца яна там і цяпер.

— Прычым частка экспазіцыі — інтэрактыўная, — працягвае суразмоўца. — Гэта значыць, што школьнікі могуць на сабе выпрабаваць, наколькі складаная была праца пажарных паўтара стагоддзя таму. Без трэніроўкі пампаваць ваду ўручную доўга не атрымаецца нават у дужага падлетка. Ды і хапала 400-літровай бочкі на некалькі хвілін работы. Таму не раз пажарныя былі вымушаны ехаць да бліжэйшай ракі па новую порцыю вады. Самая ж небяспечная прафесія была ў ствольшчыкаў, якія адпраўляліся ў самае пекла. І ў тыя часы існавала негалоснае правіла: разявакі, якія збягаліся паглядзець на тое, як тушаць полымя, стараліся абліць ствольшчыка вадой. Гэта было неабходна для таго, каб хоць крыху прадоўжыць яго бесперапынную працу. Ствольшчыкі ў даўгу не заставаліся — пасля яны дзякавалі нераўнадушным месцічам.

**Толькі ўявіце сабе лічбу: у 1986 годзе ў пажарах на тэрыторыі тагачаснай БССР загінуў 101 малы! Гэта чатыры звычайныя класы. А летась гэтая колькасць зменшылася роўна ў 101 раз.**

...Каля сцяны захавалася мадэль каланчы. Калісьці на іх дзяжурылі дазорныя, якія пастаянна аглядалі горад з вышыні. Як толькі дзесьці пачынаў курэць падазроны дымок — тут жа дазорны вывешваў адзін са сцягоў, які азначаў раён бяды, і пачынаў калаціць у звон. Гук набата разносіўся вельмі і вельмі далёка. Адна такая каланча дажыла і да нашых дзён. Яна знаходзіцца на вуліцы Магілёўскай.

Калісьці пажарны разлік выглядаў так: наперадзе на кані ляцеў брандмайстар, які трубіў на ўсю моц сваіх лёгкіх. Ззаду разам з бочкай ехалі пажарныя, адзін з якіх што меў сілы калаціў у званок. Усё гэта было неабходна для таго, каб даць дарогу разліку, які спяшаўся ліквідоўваць бяду. У тым ліку — і з рызыкай для ўласнага жыцця. На адной з паліц размешчаны аўтэнтычныя каскі царскай эпохі. Амаль на ўсіх іх жывога месца няма ад розных умяцін. Гэта сляды ад таго, што абрынալася падчас гарэння проста на пажарных. Каб хоць крыху абараніць іх, каскі выпускаліся на манер французскіх кірас — з грабянём, які выступаў наверсе.

## Наглядна пра страшнае

У другой зале наведвальнікаў сустракае інтэрактыўны манекен, якога калісьці назвалі Карынай. Ён апавядае пра правілы пажарнай бяспекі і падказвае, як правільна выклікаць ратавальнікаў. Побач стаяць іншыя манекены — іх адзелі ў сучасную форму барацьбітоў з агнём. На ёй не знайсці ніводнага гузіка, толькі карабіны — яны вельмі надзейна зашпільваюцца.

Побач з манекенамі размешчаны страшны лічыльнік. Ён паказвае колькасць пажараў і тых, хто на іх загінуў. Звесткі абнаўляюцца штодня. Крыху правей ад лічыльніка — нямыя сведкі пажару. Цэлы стол загружаны аплаўленымі электрычнымі прыборамі: тэлефонамі, тэлевізарамі, радыёпрыёмнікамі, магнітоламі, чайнікамі, прасамі. І ад усведамлення таго, што гэта рэальныя рэчы, а не макеты, становіцца яшчэ больш жудасна. Калісьці іх проста пакінулі без нагляду, і якраз у гэты час у іх адбылося кароткае замыканне. Асобны стэнд наглядна дэманструе разбураныя секцыі шматпавярховага дома пасля выбуху газу.

| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 48 511 | 12 705 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (149 512) | (134 493) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (19 279) | (33 929) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | **701** | | **169 153** | **79 453** |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (4 924) | (2 986) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 26 213 | 242 406 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (379 249) | 86 868 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (38 441) | (263 861) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (17 219) | 29 714 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | **702** | | **(413 620)** | **92 141** |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | - | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | (22 648) | 322 504 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 359 060 | (269 292) |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг банка | 70303 | | 101 135 | (30 386) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (21 149) | 16 723 |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств - итого | **703** | | **416 398** | **39 549** |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | **70** | | **171 931** | **211 143** |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (24 199) | (22 480) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | (397) | 2 744 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | **71** | | **(24 596)** | **(19 736)** |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | 79 402 |
| 39 | Выкуп акций собственной эмиссии | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | 20 | (57 865) | (60 498) |
| 42 | Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 72104 | | - | - |
| 43 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | **72** | | **(57 865)** | **18 904** |
| 44 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | **73** | | **(36 404)** | **(12 890)** |
| 45 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | **74** | | **53 066** | **197 421** |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | **740** | **5** | **X** | **600 254** |
| 47 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | **741** | **5** | **653 320** | **X** |

Председатель правления В. Д. Бабарико.

Главный бухгалтер Н. М. Дылевская.

Дата подписания: 20 января 2020 г.

## Аудиторское общество с ограниченной ответственностью

Логойский тракт, 22а, пом. 46, к. 410,
г. Минск, 220090
Тел./факс +375 (17) 370 52 96,
Тел. +375 (17) 370 52 97(98)
http://www.auditel.by
e-mail: auditel@mail.ru, auditel@tut.by

Аудитэл

УНП 100591487

Исх. 2 — Председателю правления ОАО «Белгазпромбанк» Бабарико В. Д.

22.01.2020 — Акционерам, совету директоров ОАО «Белгазпромбанк»

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Белгазпромбанк», подготовленной по итогам деятельности за 2019 год

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности Открытого акционерного общества «Белгазпромбанк» (далее – ОАО «Белгазпромбанк», Банк) (место нахождения: 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 19.08.1991, регистрационный № 16, УНП 100429079), состоящей из: бухгалтерского баланса по состоянию на 1 января 2020 года (Форма 1), отчета о прибылях и убытках (Форма 2), отчета об изменении собственного капитала (Форма 3), отчета о движении денежных средств за 2019 год (Форма 4), примечаний к годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Указанная годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность (далее – годовая финансовая отчетность) была подготовлена руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 57-З «О бухгалтерском учете и отчетности», постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года № 728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления бухгалтерской (финансовой) отчетности в Национальном банке Республики Беларусь, банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь, открытом акционерном обществе «Банк развития Республики Беларусь», постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 507 «Об утверждении Инструкции по составлению годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности» и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки годовой финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

По нашему мнению, прилагаемая годовая финансовая отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение ОАО «Белгазпромбанк» на 1 января 2020 года, финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2019 год, в соответствии с законодательством и нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности банками.

**Основание для выражения аудиторского мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» (далее – Закон об аудиторской деятельности) и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к Банку согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

**Ключевые вопросы аудита**

Ключевой вопрос аудита – это вопрос, который, согласно нашему профессиональному суждению, является наиболее значимым для аудита годовой финансовой отчетности. Ключевой вопрос рассмотрен нами в контексте аудита годовой финансовой отчетности в целом и при формировании нашего мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения об этом вопросе.

***Специальный резерв на покрытие возможных убытков по активам Банка, подверженным кредитному риску***

Специальный резерв на покрытие возможных убытков по активам Банка, подверженным кредитному риску, определен как ключевой вопрос аудита. Выбор ключевого вопроса обусловлен преобладанием кредитов в составе активов Банка, значимостью оценки активов с учетом кредитного риска для составления форм годовой финансовой отчетности. Вместе с тем подходы к оценке кредитного риска предполагают учет различных факторов и условий с использованием профессионального суждения, что не исключает риск существенных искажений годовой финансовой отчетности.

Нами рассмотрена и дана оценка методологии определения уровня кредитного риска и расчета требуемого резерва как на индивидуальной основе, так и по совокупности. Наши аудиторские процедуры были разработаны и выполнены в соответствии с рисками, присущими формированию и использованию специального резерва на покрытие возможных убытков по активам Банка. В рамках аудиторских процедур рассмотрена обоснованность оценки уровня кредитного риска, достаточность сформированного резерва для его покрытия, влияние резервов на финансовый результат Банка.

**Прочие сведения**

Аудит годовой финансовой отчетности Банка за 2018 год был проведен другой аудиторской организацией, которая выразила немодифицированное аудиторское мнение о данной отчетности в аудиторском заключении от 18 января 2019 года.

**Обязанности Банка по подготовке годовой финансовой отчетности**

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля Банка, необходимой для подготовки годовой финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке годовой финансовой отчетности руководство Банка несет ответственность за оценку способности Банка продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в годовой финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление контроля за процессом подготовки годовой финансовой отчетности Банка.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая финансовая отчетность Банка не содержит существенных искажений вследствие ошибок, недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона об аудиторской деятельности и национальных правил аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок, недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей годовой финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона об аудиторской деятельности и национальных правил аудиторской деятельности, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения годовой финансовой отчетности вследствие ошибок, недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений годовой финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

- получаем понимание системы внутреннего контроля Банка, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;

- оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в годовой финансовой отчетности;

- оцениваем правильность применения руководством Банка допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности Банка продолжать свою деятельность непрерывно. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что Банк утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

- оцениваем общее представление годовой финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также способность годовой финансовой отчетности обеспечивать достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля (при их наличии).

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

**Заключение по иным требованиям законодательства**

Нами также проведен аудит отчетности по формам: расчет достаточности капитала и величины левереджа по состоянию на 1 января 2020 года (форма 2801); отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам, подверженным кредитному риску, и операциям, не отраженным на балансе по состоянию на 1 января 2020 года (форма 2807); раздела I «Расчет величины покрытия ликвидности и чистого стабильного фондирования» расчета ликвидности по состоянию на 1 января 2020 года (форма 2809 (раздел I)), составленным на основании годовой финансовой отчетности Банка.

Указанные формы были подготовлены руководством Банка в соответствии с постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172 «Об установлении форм отчетности и утверждении Инструкции о порядке составления и представления банками, открытым акционерным обществом «Банк развития Республики Беларусь» и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь». По нашему мнению, информация, включенная в отчетность по формам 2801, 2807, 2809 (раздел I), составленным на основании годовой финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк» по состоянию на 1 января 2020 года, достоверна во всех существенных аспектах.

Руководство ОАО «Белгазпромбанк» несет ответственность за подготовку и достоверное представление отчетности по формам 2801, 2807, 2809 (раздел I) в соответствии с требованиями банковского законодательства Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля Банка, необходимой для их подготовки.

В наши обязанности входило выражение мнения о достоверности информации, включенной в отчетность по формам 2801, 2807, 2809 (раздел I), составленным на основании годовой финансовой отчетности Банка по состоянию на 1 января 2020 года.

Директор АООО «Аудитэл» — А. И. Папковский

Аудитор, возглавлявший аудит — А. И. Папковский

**Сведения об аудиторской организации**

| | |
|---|---|
| Наименование аудиторской организации: | Аудиторское общество с ограниченной ответственностью «Аудитэл» (АООО «Аудитэл») |
| Место нахождения: | 220090, Республика Беларусь, г.Минск, Логойский тракт, 22а, пом. 46, к. 410 |
| Сведения о государственной регистрации: | свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации выдано Минским городским исполнительным комитетом, решение от 28 сентября 2000 года №1097. |

УНП 100591487

Тое, што помніцца

# Міхась САВІЦКІ: «Найвышэйшае хараство — праўда»

Вось ужо амаль дзесяць гадоў, як пайшоў з жыцця Міхаіл Андрэевіч Савіцкі.

Выдатны беларускі мастак. Народны мастак СССР. Акадэмік нацыянальнай акадэміі мастацтваў Расіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Герой Беларусі.

Ды я не пра заслугі. Хоць яны таксама характарызуюць чалавека, бо проста так ні званні, ні ордэны не даюцца. Іх трэба заслужыць. Талентам. Працаю. Вернасцю свайму народу.

За кожнай такой узнагародай — свая гісторыя. І гэта, безумоўна, цікава, важна.

Але я хачу згадаць крыху іншае. Не тое, як чалавек ішоў да сваіх заслуг, а чым ён жыў, што яго радавала, а што хвалявала, трывожыла, што любіў, а што не прымаў, з чым рашуча змагаўся.

Пры жыцці Міхаіла Савіцкага неаднойчы крытыкавалі. Жостка, неаб'ектыўна, несправядліва. Савецкія чыноўнікі, напрыклад, абвінавачвалі яго ў тым, што ён скажае кіпучую стваральную рэчаіснасць, адступае ад прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму. І забаранялі некаторыя яго карціны, не пускалі на выстаўкі. Пазней тыя ж чыноўнікі, перафарбаваўшыся ў дэмакратаў, наадварот, папракалі мастака, што ён быў апалагетам сацыялістычнага рэалізму, падпявалам савецкай улады, рупарам камуністычных ідэй.

Канешне, Міхаілу Андрэевічу было балюча такое чытаць альбо слухаць. Ды ён стараўся на гэта не звяртаць увагі. Ішоў сваёй дарогай, апантана рабіў сваю справу. Працаваў без выхадных і свят. Прастойваў каля мальберта па 10—12 гадзін у суткі, бясконца перарабляючы свае карціны, настойліва дабіваючыся таго, што задумана.

Ён ніколі не пісаў з натуры. Выношваў свае сюжэты ў думках, і толькі тады, калі ідэя, змест і нават дэталі будучай карціны бачыліся ясна, дакладна, пераносіў вынашанае, выпеставанае на палатно — без папярэдніх эскізаў, малюнкаў, эцюдаў.

Так нараджаліся практычна ўсе яго славутыя карціны — «Партызанская мадонна», «Плач аб загінулых героях», «Хлябы», «Куст руж», «Пушкін і Ганчарова», «Філосафы», «Выгнанне з раю», «Аплакванне»... Гэтак жа, на адным дыханні, ствараліся ўнікальныя серыі «Лічбы на сэрцы» і «Чорная быль», «Запаведзі асалоды» і «XX стагоддзе».

Кажуць: незаменных няма. Няпраўда. Сёння, калі Савіцкага няма, адчуваецца вялікі незапоўнены прагал у нашым мастацтве. І яго ўжо ніякім іншым талентам не запоўніш. Таму што кожны талент — непаўторны.

Пра яго гаварылі і гавораць рознае. Сцвярджаюць, напрыклад, што Савіцкі вытоптваў вакол сябе ўсё больш-менш здольнае, арыгінальнае, каб не было канкурэнтаў. Хлусня! Хто, як не Савіцкі, стварыў акадэмічныя майстэрні, дзе займаліся дзясяткі маладых мастакоў, якіх ён клапатліва апекаваў, перадаючы ім сакрэты майстэрства жывапісу? І не віна Майстра, што некаторыя з іх не сталі вядомыя, славутыя — у кожнага свой лёс, свая ўдача.

А яшчэ кажуць, што Савіцкі быў воўкадзіночка. І гэта таксама няпраўда. Неаднаразова быў сведкам, калі за гасцінным сталом у яго майстэрні збіраліся вядомыя людзі — пісьменнікі Васіль Быкаў і Алесь Адамовіч, акадэмік Мікалай Барысевіч, акцёр Расціслаў Янкоўскі і многія іншыя. І за кубачкам чаю, а то і мацнейшага напою гадзінамі вялі гарачыя дыскусіі на самыя розныя тэмы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Так, у Міхаіла Андрэевіча сяброў было мала. Іх можна пералічыць на пальцах адной рукі. Георгій Паплаўскі, Анатоль Зайцаў, яшчэ два-тры чалавекі. Але, па-першае, сяброў наогул многа не бывае. А па-другое, канешне ж, у гэтым іграў сваю ролю характар Міхаіла Андрэевіча. У яго заўжды быў свой прынцыповы погляд на пытанні мастацтва і ў цэлым жыцця. Гэты погляд часам рэзка адрозніваўся ад погляду яго калег, што не магло не раздражняць. Нездарма ж кажуць: здольным зайздросцяць, таленавітым шкодзяць, а геніяльным помсцяць.

Савіцкаму на працягу ўсяго яго творчага жыцця не давалі спакою: пісалі ананімкі, даносы, пляжылі адкрыта і за спінай, наладжвалі ганебныя інтрыгі і правакацыі. Дзіву даешся: як пры яго слабым здароўі ён мог вытрымліваць такія дзікія псіхалагічныя і душэўныя нагрузкі? І пры гэтым нястомна, апантана, плённа працаваць.

Як самы суровы аргумент супраць Савіцкага яго нядобразычліўцы прыводзяць той факт, што ён, маўляў, не любіў нічога беларускага, у сваёй творчасці быў касмапалітам. Больш абсурднага абвінавачвання цяжка прыдумаць, бо ўсё, што ён стварыў, прасякнута шчырай, гарачай любоўю да роднай зямлі, пякучым, шчымлівым болем за яе беды, няшчасці, праблемы.

А што датычыцца беларускай мовы, то ён гаварыў на ёй сапраўды кепска — так склаліся жыццёвыя абставіны. І таму саромеўся гаварыць па-беларуску, але любіў чытаць творы беларускіх пісьменнікаў. А многае з паэзіі Багдановіча, Купалы, Коласа ведаў на памяць. У яго, дарэчы, была ўнікальная бібліятэка, якую ён збіраў усё жыццё.

З Міхаілам Андрэевічам Савіцкім я быў знаёмы больш за два дзесяцігоддзі. Не скажу, што ў нас былі блізкія адносіны. Але мы рэгулярна перазвоньваліся — з нагоды свят, дзён нараджэння, з якой-небудзь іншай нагоды. А нярэдка і сустракаліся. Па справе, па душэўнай патрэбе. Сам-насам і ў таварыскім коле. Іх, гэтых сустрэч, было нямала. Я ж хачу згадаць толькі дзве — найбольш важныя, ключавыя, што адбыліся на пераломе часу, у самыя адказныя, вызначальныя моманты жыцця нашай краіны.

## Служэнне ісціне, дабру, хараству

**Сакавік 1988 года.**

У майстэрню Савіцкага мы прыйшлі ўдвух з загадчыкам аддзела культуры Мінскага абкама партыі Яўгенам Стрыжэвічам. Пра сустрэчу дамовіліся загадзя, папярэдзіўшы Міхаіла Андрэевіча, што хацелася б з ім пагаварыць-параіцца па некаторых пытаннях грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. Ужо нават недасведчанаму ў палітыцы чалавеку было відавочна: нешта ў краіне адбываецца нядобрае, некуды хвалёная перабудова, якую мы сустрэлі з такім уздымам і надзеяй, вядзе нас убок, у тупік. У грамадстве пачаліся хваляванні, асабліва сярод творчай інтэлігенцыі. Працэс гэты набываў не толькі малакіраваны, але і надзвычай небяспечны характар.

Адчуванне катастрофы, якая неадольна насоўваецца, вымушала кожнага неабыякавага чалавека сур'ёзна задумацца: што ж гэта навокал адбываецца? Адкуль узялося гэтулькі шалёных, раззлаваных крытыкаў усяго і ўсіх? І чаму, у рэшце рэшт, так лёгка, з такім вясёлым захапленнем пайшла за імі большасць нашых людзей?

З гэтай трывогай, гэтым болем да Савіцкага мы прыйшлі невыпадкова. Міхаіл Андрэевіч — не толькі выдатны мастак, але і сапраўдны мысліцель. Слухаць яго неверагодна цікава. Запіс гэтай гутаркі ў мяне захаваўся.

*— Міхаіл Андрэевіч, адной з прычын шырокага распаўсюджання псеўдамастацтва, маскультуры вы назвалі прымітыўнасць мастацкага густу ў нашых людзей. Але ж савецкая дзяржава столькі рабіла і робіць для фарміравання гэтага густу...*

— Так, робіць. Але недастаткова. А калі гаварыць па вялікім рахунку, то часам і не тое, і не так.

Возьмем нашу школьную і дашкольную адукацыю. Гэта ж самы адказны ўзрост — дзяцінства, юнацтва, калі ў чалавеку закладваюцца асновы яго светапогляду, яго духоўнасці. І найлепшым выхаваўцам гэтых якасцяў з'яўляецца мастацтва, літаратура.

А што мы маем на практыцы? Эстэтычнае выхаванне ў нашых школьных і дашкольных установах ледзь-ледзь ліпіць. Кажу пра гэта з поўнай адказнасцю, бо апошнім часам я дастаткова грунтоўна вывучыў гэту праблему і як дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, і як старшыня Мінскага абласнога аддзялення Савецкага фонду культуры.

Ды вось, скажу адназначна: эстэтычнае выхаванне — ахілесава пята нашай адукацыі. Менавіта тут як нідзе трывала ўкараніўся прынцып астаткавага фінансавання. Школа чамусьці не бачыць патрэбы ў тым, каб навучыць будучага грамадзяніна і працаўніка асновам мастацтва. Лічыцца, што гэта — дробязь, само сабою прыкладзецца. Вось чаму ў нашай школе маляванне, спевы, харэаграфія — другарадныя прадметы, ды і тыя заканчваюцца недзе ў класе шостым-сёмым. Факультатывы і гурткі, якія дзе-нідзе арганізаваны, становішча не выратоўваюць.

*— Міхаіл Андрэевіч, але многае тут ад нас не залежыць...*

— Не залежыць... А ад каго, скажыце, калі ласка, залежыць той факт, што ў нашай школе роднай мове надаецца менш часу, чым матэматыцы або фізіцы? Спасылаюцца на замежны вопыт. Але ж у тых жа капіталістаў роднай мове адводзіцца 60 працэнтаў вучэбнага часу. У старажытных грэкаў і рымлян рыторыка, акцёрскае майстэрства былі найгалоўнейшымі прадметамі. Ды што пра гэта гаварыць! Мы, як ні дзіўна, не маем часу нават на родную гісторыю, не спадобіліся напісаць сапраўдны падручнік. Сумна, сорамна і вельмі небяспечна, калі асобныя прадстаўнікі нават творчай інтэлігенцыі пачынаюць выракацца роднай мовы, гісторыі свайго народа, яго культуры.

*— У чым, на ваш погляд, прычыны гэтай трывожнай з'явы?*

— Галоўная прычына, і ў гэтым я перакананы, заключаецца ў нізкім, недастаткова эфектыўным ідэйна-маральным выхаванні. І не толькі школьнікаў, але і дарослых. Што такое рэальны сацыялізм? Гэта — новыя, сацыялістычныя адносіны паміж людзьмі. Адносіны, заснаваныя на роўнасці, справядлівасці, дабрыні.

А што мы маем? У апошнія гады сталі губляць нават тое, што было. У грамадстве буяюць хамства, хцівасць, крадзяжы і іншыя негатыўныя з'явы. Мы ж далікатнічаем, асцярожнічаем. Замест слова «злодзей» прыдумалі ледзь не ласкавае «нясун». Занадта спагадліва адносімся да такіх заган, як зайздрасць, плёткі, інтрыганства і іншыя. Не сустракаючы належнага адпору, гэтыя заганы інтэнсіўна ўкараняюцца і становяцца ледзьве не нормай нашага паўсядзённага жыцця.

Асноўная бяда нашага выхавання заключаецца ў тым, што мы прывыклі працаваць з масамі. А трэба працаваць індывідуальна, з кожным чалавекам паасобку. Вось і нясём адчувальныя страты. Вось і цярпім паразу за паразай у сённяшняй барацьбе дабра і зла.

*— Цяжка не прызнаць справядлівасці вашых папрокаў. Але, згадзіцеся, адрасаваны гэтыя папрокі павінны быць не толькі кіраўнікам рэспублікі, але і нашай інтэлігенцыі, перш за ўсё творчай інтэлігенцыі.*

— Яно сапраўды так. Хоць я і не магу пагадзіцца з рэзкай ацэнкай, якую ў свой час даў інтэлігенцыі У. І. Ленін, назваўшы яе г...ном. Не магу, бо нацыя без інтэлігенцыі — творцы культуры — гіне: жывы арганізм немагчымы без мозга, без нервовай сістэмы. Ну а тое, якая гэтая інтэлігенцыя, залежыць не толькі ад яе самой, але і ад сістэмы ўлады, ад стану народа.

Хачу напомніць азбучную ісціну: ніводнай сур'ёзнай задачы мы не вырашым, калі не будзем клапаціцца аб росквіце творчай думкі, аб інтэлігенцыі. Калі абмяжуем яе правы і магчымасці ўплываць на грамадскае развіццё.

## Асэнсоўваць лёс чалавека

**Снежань 2004 года.**

Я даўнавата ўжо не бачыў Міхаіла Андрэевіча, гадоў пяць. За гэты час Майстар знешне амаль не змяніўся. Такі ж аскетычна хударлявы, з дапытлівым позіркам, з моцным поціскам рукі. Хіба што прыбавілася сівізны ў валасах ды паходка стала больш павольная, асцярожная. Што ж, зразумець можна: Міхаілу Андрэевічу пайшоў, дзякуй богу, восемдзесят трэці...

Але аказалася, што асцярожнасць гэтая зусім не ад узросту. Мінулай зімой Міхаіл Андрэевіч паслізнуўся і вельмі няўдала прызямліўся — зламаў шыйку бядра. Перанёс цяжкую аперацыю. Паўгода прыходзіў у сябе. Не паспеў акламацца — на пачатку гэтай зімы зноўку ўпаў, пашкодзіў калена. Гэтым разам ужо не стаў ні да якіх урачоў звяртацца — зноў прымусяць перайсці на пасцельны рэжым, закуюць у гіпс і мінімум месяц, а то і два будзе згублена. А ў яго і так назбіралася ўжо з дзясятак ненапісаных, але да дробязяў прадуманых карцін. І на калена махнуў рукою. Праўда, сямейнікі ўсё ж угаварылі паспрабаваць народныя лекі. Нібыта нічога, абышлося.

Але была ў гэтым годзе і прыемная падзея ў жыцці мастака — яму ўручылі прэмію Саюзнай дзяржавы. Падзея не проста прыемная, але і надзвычай важная. З гэтага і пачалася наша гаворка.

*— Міхаіл Андрэевіч, дазвольце перш за ўсё сардэчна павіншаваць вас з атрыманнем высокай прэміі. Што яна для вас азначае?*

— Дзякую. Што азначае? Вельмі многае. Па-першае, гэта прызнанне маіх дасягненняў у галіне жывапісу, у галіне мастацтва. А па-другое, гэта ацэнка маіх заслуг ва ўмацаванні і развіцці культурных, грамадскіх сувязяў паміж Беларуссю і Расіяй.

*— Міхаіл Андрэевіч, а вось кажуць, што мастак заўсёды павінен быць у апазіцыі да ўлады. Вы згодны з гэтым? А калі ўлада разумная і робіць усё правільна?*

— Па-першае, мастак павінен быць перш за ўсё грамадзянінам. І як грамадзянін абавязаны быць разам са сваёй краінай, са сваім народам. Я не цярплю, калі зняважліва-адчужана кажуць: гэтая краіна, гэты народ. На мой погляд, гэта найгоршы і самы няплённы від апазіцыі.

А па-другое, мастак павінен заўсёды заставацца мастаком. Яго галоўная задача — адлюстроўваць у сваіх работах той час, у якім ён жыве. І работы гэтыя павінны быць не дэкларатыўныя, не ліслівыя, а вельмі сумленныя, аб'ектыўныя. А адукаваны чалавек прачытае па іх усё: і добрае, і кепскае.

Іншымі словамі, мастак павінен пісаць свой час. І галоўны кірунак яго творчасці — непрыняцце зла, абарона дабра. Вось і ўся канцэпцыя. Пры гэтым, канешне, узровень майстэрства павінен быць найвышэйшы. Пастаянна неабходна суадносіць свае работы з тымі дасягненнямі, якія ў мастацтве ўжо заваяваны.

*— Вось мы ўвесь час гаворым «мастак абавязаны», «мастак павінен», «служэнне народу»... А ці не абмяжоўваюць гэтыя своеасаблівыя катэгарычныя імператывы свабоду творчасці?*

— Сапраўдны мастак, які глыбока разумее сутнасць і прызначэнне мастацтва, ніякіх абмежаванняў не адчувае. Пры любых знешніх абставінах! Таму што ў яго душы жыве адна, унутраная свабода, якую ніхто не можа адмяніць. І гэтая свабода, кажучы словамі Маркса, ёсць усвядомленая неабходнасць. Неабходнасць служэння мастацтву, а праз мастацтва — служэння грамадству.

*— Міхаіл Андрэевіч, ёсць два прама процілеглыя творчыя прынцыпы. Першы сфармуляваў Горкі: калі можаш не пісаць — не пішы. І другі прынцып, якога прытрымліваўся Пушкін: натхненне — рэдкі госць, і неабходна, каб ён заставаў цябе за работай. А як працуеце вы?*

— Пушкінскае вызначэнне выдатнае. Я так і раблю. Натхненне — гэта вынік набытых дасягненняў, вопыту. Усё гэта акумулюецца, захоўваецца ў памяці і аднойчы завяршаецца творчай успышкай, нейкім азарэннем. І работа працягваецца.

*— А калі вы адпачываеце? І якім чынам?*

— Адпачываю, мяняючы занятак. Мне вялікае задавальненне дастаўляе чытанне. Але не дэтэктываў, не любоўных раманаў, а сур'ёзнай, глыбокай літаратуры. Кніг па мастацтве, гісторыі. Вось і зараз на маім рабочым стале ляжаць працы выдатнага расійскага гісторыка Мікалая Кастамарава.

А яшчэ я люблю працаваць на зямлі. Гэтая любоў у мяне засталася з дзяцінства, прывіта бацькам. Сёння, праўда, у маім распараджэнні зямлі няшмат — сотак дзевяць, якія выдзяліў мне гарвыканкам каля дома. Але я пастараюся гэты ўчастак максімальна добраўпарадкаваць. Пасаджу пладовыя дрэвы, кусты. Многія яблыні ўжо пладаносяць...

* * *

І Міхаіл Андрэевіч узяўся раскрываць мне тонкасці і сакрэты садовай справы з такім захапленнем, з такім веданнем прадмета, што ў гэтыя хвіліны яму пазайздросціў бы любы прафесіянал.

Вось ужо не думаў выявіць у Майстру гэту нечаканую і як быццам далёкую ад мастацтва схільнасць. Зрэшты, чаму ж далёкую? Садоўніцтва — гэта другі бок яго прызвання: тварыць прыгожае, карыснае, патрэбнае... І каторы раз даводзіцца пераконвацца ў справядлівасці ісціны: таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

Пісьменнік і час

# Поле нашай духоўнасці ніхто за нас не дагледзіць

**ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎНІКА**

**Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Зіновій Прыгодзіч — аўтар больш чым дваццаці мастацкіх і дакументальных кніг. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, а таксама прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне літаратуры. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў. Кандыдат філасофскіх навук.**

**Працаваў галоўным рэдактарам газеты «Советская Белоруссия», першым намеснікам старшыні Дзяржкамдруку. Цяпер галоўны рэдактар папулярнага выдання «Гаспадыня. Сямейны часопіс».**

**Пастаянны аўтар «Звязды».**

***— У кнізе «Над Вісліцай» вы падзяліліся ўласным бачаннем дзён мінулых сваёй малой Радзімы — Піншчыны. Сёння я запрашаю вас зазірнуць у яе заўтрашні дзень, калі паўсюдна будзе гаспадарыць буйнатаварная вытворчасць. Хочам мы ці не, але будучыня айчыннага аграпрамысловага сектара — менавіта ў буйнатаварнай вытворчасці, далейшым узбуйненні гаспадарак. Праўда, не застанецца месца хутарам і нават маленькім вёсачкам, у якіх дагэтуль жывуць людзі.***

***Як вы лічыце, вось гэтая ломка вясковага побыту, якая стала прыкметай часу, чыста псіхалагічна даецца людзям проста?***

— Калі задумацца, то гэта — сапраўдныя тэктанічныя зрухі, а мо і разломы, на значных тэрыторыях. Вы пытаецеся, як яны адгукваюцца ў людзях? Ведаючы натуру браткоў беларусаў, далікатную і лёгка ранімую, разумею, што даецца такое складана. Расійскі пісьменнік Валянцін Распуцін у сваім творы «Развітанне з Мацёрай» ва ўсіх дэталях апісаў чалавечую драму менавіта такога кшталту. Беларусы перажылі сваю драму, калі з-за «мірнага атама» сотні тысяч людзей са слязамі рушылі з наседжаных месцаў.

Зараз мы разглядаем з вамі крыху іншую сітуацыю. І павінны браць пад увагу, што знікненне малых ці, як іх раней называлі, неперспектыўных вёсачак і будаўніцтва буйных, добраўпарадкаваных аграгарадкоў — працэс аб'ектыўны і непазбежны. Такое адбываецца не толькі ў нас, але і ў многіх іншых краінах.

Маленечкія вёскі з іх неўпарадкаванасцю вымараюць, так. Аднак не ўсё адназначна. І ў досыць вялікіх паселішчах праблем хапае. У маёй роднай вёсцы Лышча налічваецца 167 гаспадарак і 370 жыхароў. А ў гады маёй маладосці тут было каля трохсот гаспадарак і больш за тысячу жыхароў. У школе займаліся два паралельныя дзясятыя класы. А летась ледзь набралі дзяцей у першы клас. Некалі валейбольная каманда ўдзельнічала ў фінале рэспубліканскіх спаборніцтваў, грымеў на ўсю вобласць гурт мастацкай самадзейнасці. Нічога гэтага цяпер няма.

Баліць душа і за духоўны стан сённяшняй вёскі. Яна не толькі ўзбуйняецца, індустрыялізуецца, але і траціць прыкметы старога, крышку патрыярхальнага, а таму больш маральнага жыцця.

***— Часта калегі-журналісты пытаюцца ў герояў сваіх інтэрв'ю: «Новае пакаленне лепшае за папярэднія?» Мяне асабіста цікавіць новае пакаленне вяскоўцаў. Сёння малады механізатар — сапраўдная эліта на вёсцы. Бо яго «Кіравец» і гомельскі камбайн апошняй маркі аснашчаны камп'ютарам, а пад рукой столькі «коней», колькі раней не было ва ўсёй калгаснай стайні. Гэтая ўзброенасць павінна мяняць і яго самога. Ці паспявае духоўна малады вясковец у сваім развіцці за тэхнічным прагрэсам?***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Калі быць аб'ектыўным, то, канешне ж, розныя ёсць вёскі і розная ў іх так званая эліта. У перадавых, багатых гаспадарках, дзе віруе культурнае жыццё, духоўнасць маладых вяскоўцаў на ўзроўні. Сцвярджаю гэта, зыходзячы з уласных назіранняў. Вось да чаго варта імкнуцца. За прыклад можна браць у маім раёне той жа «Аснежыцкі» ці саўгас «Парахонскі».

Аднак баюся, што ў многіх вёсках моладзь дагэтуль пазбаўлена элементарнага — прыстойнага дома культуры, добраўпарадкаванага стадыёна і гэтак далей. І чым яна бавіць свой вольны час, што ў яе на душы — цяжка сказаць. Ніхто з сённяшніх «інжынераў чалавечых душ» гэтыя працэсы не даследуе. (Папрок у адрас калег, пісьменнікаў і журналістаў.) Раней у нас былі Ігнат Дуброўскі, Вера Палтаран, Васіль Праскураў. Як яны пісалі пра вёску — дасведчана, глыбока, з любоўю! Хто цяпер так піша? Ніхто.

***— Мы з вамі размаўляем пра такую тонкую матэрыю, як душа вясковага чалавека. І вось тут узнікаюць «праклятыя пытанні» паўсядзённасці. Як затрымаць маладога чалавека на вёсцы? Хто возьме на сябе адказнасць за яго маральнасць? Якая роля тут адводзіцца вясковай інтэлігенцыі?***

— Як затрымаць маладога чалавека на вёсцы? Гэта праблема з праблем. Над яе вырашэннем думаюць многія светлыя галовы.

У Мядзельскім раёне, у вёсцы Камарова мне давялося пазнаёміцца з Эдуардам Вайцяховічам, чалавекам няўрымслівым, ініцыятыўным. У свой час ён узначальваў тутэйшае прафесійна-тэхнічнае вучылішча, якое рыхтавала сельскіх механізатараў. І вось малады кіраўнік сутыкнуўся з тым, што ў вучылішчы быў пастаянны недабор. Непрэстыжна было ісці працаваць у сельскую гаспадарку. Чаму? А таму, што моладзі ў вёсцы нецікава.

І тады Вайцяховіч загарэўся ідэяй стварыць у Камарове на базе вучылішча Цэнтр развіцця сельскага прадпрымальніцтва. Каб тут рыхтавалі не толькі механізатараў, але і будаўнікоў, кухараў, пекараў, механікаў — прычым навучалі іх асновам вядзення бізнесу.

І цяпер у Камарове ёсць свой бізнес-інкубатар, дзе маладыя людзі (і не толькі маладыя) праходзяць адпаведны курс прадпрымальніцкай навукі, набываюць практычныя навыкі бізнесу.

А Вайцяховіч ужо думае пра большае. Пра тое, што яшчэ можна арганізаваць на сяле. На Захадзе шырока прымяняецца субкантрактацыя, калі буйное прамысловае прадпрыемства, размешчанае ў горадзе, мае значную колькасць невялікіх прыватных філіялаў у вёсцы. Кожны з такіх філіялаў спецыялізуецца на вырабе якой-небудзь адной дэталі і пастаўляе яе на галоўны канвеер. То чаму б не стварыць у нашых вёсках такія малыя прадпрыемствы? І даць моладзі перспектыўную работу.

***— У кантэксце сённяшняй гутаркі нельга не абмеркаваць ролю вясковай інтэлігенцыі. Агранома, доктара, настаўніка, старшыні сельсавета... Давайце смела ўключаць у наш пералік і кіраўніка гаспадаркі. Ад узроўню культурнасці гэтых знакавых на вёсцы людзей залежыць ці не ўсё.***

— Безумоўна, паняцці «інтэлігент» і «культура» непадзельныя. У ідэале. Але калі ў ідэале, тады і жыць лёгка. А вось што, скажыце, рабіць маладому спецыялісту, калі ў гаспадарцы дом культуры на замку, спартыўных секцый няма? З'ездзіць у сталіцу на цікавы спектакль, папулярны канцэрт не заўсёды атрымліваецца... І ўсё ж, запярэчу я сам сабе, ёсць бібліятэка, ёсць тэлевізар, у рэшце рэшт ёсць (цяпер ужо і ў вёсцы) інтэрнэт. Што датычыцца апошняга, то важна разумна ім карыстацца. Гэтае найвялікшае вынаходніцтва чалавецтва можа быць як дабром, так і злом.

Карацей кажучы, інтэлігент на тое і інтэлігент, што ён не будзе чакаць, каб нехта яму арганізоўваў цікавы адпачынак, а сам пачне ствараць поле духоўнасці ў сабе і вакол сябе.

***— Я старанна перачытваў ваша сентыментальнае падарожжа на малую Радзіму — тую самую кнігу «Над Вісліцай», пра якую згадваў. Падзялюся ўражаннем: вам крыху як бы трывожна за свой край, за яго будучыню. Што вас трывожыць, калі вы прыязджаеце дамоў?***

— Шчыра скажу, на сваю малую Радзіму апошнім часам езджу без вялікай ахвоты. Тое, з чым даводзіцца там сутыкацца, доўга вярэдзіць душу. Амаль палова сядзіб глядзяць пустымі вокнамі, агароды зараслі, платы паваліліся. А па вуліцы ходзяць не заўсёды цвярозыя вяскоўцы.

А я ж сваю родную вёску памятаю іншай — людной, дагледжанай, светлай. Вечарам у розных канцах чуліся песні, дзявочы смех, музыка. З песнямі ішлі на работу і з песнямі вярталіся. Цяпер з надыходам вечара вёска глухне, нямее.

Згодны, што выйсце ва ўзбуйненні і разгортванні буйнатаварнай вытворчасці. Паўторымся: менавіта на гэтым шляху, у тым ліку на Піншчыне, многія гаспадаркі дабіліся і працоўных поспехаў, і сучасных даброт цывілізацыі.

Ёсць на Брэстчыне вядомая гаспадарка «Астрамечава». Калі хто бываў там, не мог не палюбавацца на цэнтральнай сядзібе галоўнай плошчай з выдатным палацам культуры і адміністрацыйным будынкам, гандлёвым цэнтрам, школай-дзесяцігодкай, дзіцячым садком, домам быту, кафэ-сталоўкай, гасцініцай, асфальтаванымі вуліцамі, тратуарамі. Адным словам, звычайную вёску ператварылі ў сучасны аграгарадок.

Колішні кіраўнік гаспадаркі Аляксей Скакун казаў мне:

— Я цвёрда перакананы: няма нічога больш прыбытковага, чым капітальныя ўкладанні ў чалавека — у яго быт, культуру, умовы працы і жыцця. Гэта — аснова асноў, падмурак любых поспехаў.

І ён прывёў прыклад. Параіўшыся з жывёлаводамі, работнікамі іншых падраздзяленняў, у гаспадарцы вырашылі стварыць аздараўленчую зону проста на жывёлагадоўчым комплексе. Падвалы перарабілі ва ўтульныя пакоі адпачынку, абсталявалі кабінеты медыцынскага абслугоўвання, лазню-саўну з басейнам, спартыўную залу з трэнажорамі. Тут можна не толькі папарыцца, паплаваць, прыняць падводны душ-масаж, цыркулярны душ, пасядзець каля самавара альбо тэлевізара, але і палячыцца, прыняць фізіяпрацэдуры, атрымаць парады ўрача. І ўсё гэта без асаблівага адрыву ад вытворчасці.

Важнасць такога клопату пра людзей цяжка пераацаніць. Пабудаваць новы кароўнік ці аснасціць трактарную брыгаду сучаснай тэхнікай — палова справы. Атрымліваецца, што сапраўды вельмі важна мець у гаспадарцы свой палац культуры, спартыўны комплекс. Калгаснік, далучаны да мастацтва, — гэта ўжо іншы чалавек, у яго куды шырэйшы кругагляд. У яго і ў сям'і складзецца добрая атмасфера, і працаваць ён будзе лепш. Трэба таксама, каб яго дзеці не толькі маглі вучыцца ў нармальнай школе, але мелі магчымасць развіваць творчыя здольнасці.

***— Аксіёма — яна і ёсць аксіёма. Падзяліцеся літаратурнымі планамі, Зіновій Кірылавіч. Што на рабочым стале пісьменніка?***

— Звычайна кажуць: калі хочаш насмяшыць Бога, то раскажы яму пра свае планы. Але я не баюся сурочыць, таму што план гэты ўжо практычна рэалізаваў. Напісаў кнігу пра дзяцей вайны, як хто з іх перажыў страшную навалу, як склаўся іх пасляваенны лёс. Тым самым мне хацелася б зрабіць і свой сціплы ўнёсак у народную памяць, абуджаную 75-годдзем Вялікай Перамогі.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

# Больш за 7,5 мільёна гадзін у тыдзень — каля экрана

## VOKA расказаў пра ўплыў каранавіруса на густы гледачоў

**Менш спорту, больш мульцікаў, кіно і серыялаў — такі вынік работы беларусаў на «аддаленцы».**

Відэасэрвіс VOKA, які на мінулым тыдні прадставіў беларусам доступ да самага папулярнага кантэнту на платформе, падлічыў, як змянілася актыўнасць карыстальнікаў за апошнія тыдні, калі эпідэмія COVID-19 унесла свае карэкціроўкі ў планы і звычкі беларусаў. Вынікі атрымаліся красамоўныя.

Штодзённа расце як колькасць новых карыстальнікаў, так і колькасць праглядаў, а таксама час, які людзі праводзяць перад экранам.

За апошні тыдзень колькасць праглядаў кантэнту павялічылася больш чым на 60 % у параўнанні з лютым. Пры гэтым фільмы глядзяць напалову часцей, чым серыялы. Лідарамі глядацкіх пераваг застаюцца фільмы «Халоп», «Стрыптызёршы» і «Гучная сувязь». Што датычыцца серыялаў, у топ-3 за апошні тыдзень увайшлі «Утрыманкі», «Кухня» і «Фітнес». У сярэднім за раз глядзяць па тры-чатыры серыі абранага серыяла.

З тэлеканалаў, даступных на VOKA, гледачы найчасцей выбіраюць ТНТ International, ОНТ HD і TV 1000 Action. У параўнанні з лютым, у топ-3 уварваўся фільмавы канал, а навінавыя трохі здалі свае пазіцыі. Прыраслі і дзіцячыя каналы «Мульт», Nick Jr., Nickelodeon. А вось папулярнасць спартыўных чакана знізілася — гэта звязана з адменай усіх актуальных для гледачоў спаборніцтваў.

У агульным часе прагляду ў тыдзень тэлеканалы займаюць лідзіруючую пазіцыю: за іх праглядам карыстальнікі праводзяць больш за 7,5 мільёна гадзін! Калі меркаваць па часе максімальнай глядацкай актыўнасці, то нават тыя, хто знаходзіцца на «аддаленцы», у рабочы час кантэнтам не злоўжываюць: пік праглядаў прыпадае на перыяд з 19 да 22 гадзін, а ў выхадныя нагрузка ўзрастае на 10 % у параўнанні з буднямі.

Свае карэкціроўкі ў статыстыку ўнеслі і школьныя канікулы: у топ-20 самых папулярных серыялаў увайшлі адразу дзевяць мультыплікацыйных фільмаў. Больш за ўсё дзецям падабаюцца «Барбоскіны», «Смяшарыкі» і «Мі-мі-мішкі». Але «Пакемон: чорнае і белае», «Фіксікаў», «Машу і Мядзведзя» яны таксама глядзяць з задавальненнем.

Вялікую колькасць праглядаў сабраў навукова-папулярны фільм «Таварыш вірус: вучоныя пра каранавірус». У цэлым карыстальнікі аддаюць перавагу лёгкім камедыям, часцей за ўсё расійскім і савецкім, а таксама расійскім серыялам.

Урач-псіхіятр:

# «Антыдэпрэсанты не выклікаюць прывыкання і залежнасці»

## Як перамагчы трывогу і дэпрэсіўны настрой?

**Справіцца з вялікай колькасцю інфармацыі пра невядомую раней для нас хваробу — каранавірус — псіхалагічна складана. Ды і вясна радуе цяплом і сонцам пакуль досыць скупа. Змучаны за зіму недахопам вітамінаў і сонечнага святла арганізм гатовы даць збой. Як не ўпасці ад усяго гэтага ў дэпрэсію і што ўяўляе сабой гэтае небяспечнае захворванне, расказаў урач-псіхіятр-нарколаг мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Ігар САРОКІН.**



ria.ru

***— Ігар Георгіевіч, што небяспечнага ў дэпрэсіўным настроі, які ўсе мы час ад часу адчуваем?***

— Сапраўды, прыгнечаным, маркотным раз-пораз адчувае сябе кожны. Але кожны пяты з тых, хто сёння маркоціцца, пакутуе пры гэтым да такой ступені, што мае патрэбу ў лячэнні пад наглядам доктара, і над гэтым варта задумацца. Калі на расстройства не звяртаць увагу, як робіць шмат хто з тых, хто чытае гэтыя радкі, маркота можа паглыбляцца: паступова з'яўляюцца туга, думкі аб уласнай нікчэмнасці, марнасці існавання. Страчваецца цікавасць да ўсяго, што раней складала значную частку вашага жыцця: сям'і, работы, сяброў, хобі. Жыццё здаецца бязрадасным і бачыцца толькі ў шэра-чорным колеры. Цяжка выконваць нават нескладаную, звыклую працу. З часам з'яўляюцца больш ці менш значныя фізічныя сімптомы: калачэнне сэрца, павышэнне ці зніжэнне артэрыяльнага ціску, адсутнасць ці павелічэнне апетыту, страта ці павелічэнне масы цела, сухасць у роце, адсутнасць слёз ці слязлівасць. Часам фізічныя сімптомы выходзяць на пярэдні план і непакояць чалавека ў першую чаргу. І ён можа тыднямі хадзіць па кабінетах паліклінікі, але ўсё бессэнсоўна, пакуль хворы не трапіць да псіхатэрапеўта ці псіхіятра.

***— У якіх выпадках не трэба чакаць, што настрой сам па сабе палепшыцца, і варта звяртацца па медыцынскую дапамогу?***

— Калі ў вас ці вашага блізкага цягам двух тыдняў і болей назіраюцца зніжаны настрой, страта задавальнення ад жыцця, адасабленне ад сяброў і сям'і, зніжэнне здольнасці да выкanання звыклай работы і нежаданне чымсьці займацца, у тым ліку сачыць за сваім знешнім выглядам, а таксама слабасць, цяжкасці ў канцэнтрацыі ўвагі, зніжэнне здольнасці да мыслення, бяссонніца альбо санлівасць, адчуванне ўласнай віны ці нікчэмнасці, перыядычнае ўзнікненне думак аб смерці ці самагубстве — варта неадкладна звярнуцца да псіхатэрапэўта ці псіхіятра.

Маркота мае біялагічную прычыну — як і шмат якія іншыя захворванні. У гэтым сэнсе псіхічныя парушэнні нічым не адрозніваюцца ад сардэчна-сасудзістых, гастраэнтэралагічных ці анкалагічных.

***— А ў чым прычына дэпрэсіўнага настрою?***

— Вядома, што маркота абумоўлена нізкім утрыманнем сератаніну — рэчыва, з дапамогай якога нейроны галаўнога мозга ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Пакуль няясна, па якой прычыне зніжаецца ўзровень гэтага рэчыва. Часам гэта здараецца пры некаторых хваробах, а таксама ў выніку працяглага стрэсу, празмернай трывогі, страху, якія суправаджаюць нас доўгі час. Як і любая іншая хвароба, маркотны стан, дэпрэсія могуць быць цяжкія. У залежнасці ад цяжкасці псіхічных парушэнняў псіхіятр выбірае медыкамент (антыдэпрэсант), з дапамогай якога можна павысіць узровень сератаніну ў пэўных структурах галаўнога мозга, а значыць, палепшыць настрой, вярнуць страчаныя радасць жыцця, фізічную і псіхічную актыўнасць, працаздольнасць, аптымізм, нармальны апетыт, сон, палепшыць фізічнае самаадчуванне.

***— А калі прымаць антыдэпрэсант страшнавата? Напрыклад, ёсць меркаванне, што яны выклікаюць прывыканне...***

— Трэба памятаць, што адначасова з вамі ў гэты самы момант праходзяць такое ж лячэнне мільёны людзей ва ўсім свеце і адчуваюць ад яго палёгку. Антыдэпрэсанты не выклікаюць прывыкання і залежнасці. Любы медыкамент, апроч лячэбнага эфекту, мае і пабочныя. Пра іх вам можа паведаміць ваш доктар ці вы самі прачытаеце ў інструкцыі. Звычайна непажаданыя эфекты праяўляюцца ў лёгкай форме і неўзабаве знікаюць. Калі ж пабочныя эфекты значныя, варта звярнуцца да ўрача, ён можа змяніць прэпарат.

Мы выполнили обязанности, описанные в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности» нашего заключения, в том числе по отношению к этому вопросу. Соответственно наш аудит включал выполнение процедур, разработанных в ответ на нашу оценку рисков существенного искажения годовой финансовой отчетности. Результаты наших аудиторских процедур, в том числе процедур, выполненных в ходе рассмотрения указанного ниже вопроса, служат основанием для выражения нашего аудиторского мнения о прилагаемой финансовой отчетности.

**Ключевой вопрос аудита**

***Специальные резервы на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам***

Оценка уровня специальных резервов на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам (далее — «специальные резервы») в соответствии с требованиями постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 28 сентября 2006 г. № 138 «Об утверждении Инструкции о порядке формирования и использованиями банками, открытым акционерным обществом «Банк развития Республики Беларусь» и небанковскими кредитно-финансовыми организациями специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» является ключевой областью суждения руководства Банка. При оценке кредитных рисков в значительной степени используется профессиональное суждение и допущения, а также производится анализ различных факторов, включая финансовое состояние заемщика, стоимость реализации объектов залога и прочее.

В силу существенности сумм кредитов клиентам, а также значительного использования суждений оценка специальных резервов представляет собой ключевой вопрос аудита.

Информация о специальных резервах на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам и подход руководства Банка к оценке и управлению кредитным рискам описаны в Примечаниях 3, 5.5 и 9.2 к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

***Как ключевой вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита***

Наши аудиторские процедуры были выполнены в отношении процесса создания специальных резервов по кредитам юридическим и физическим лицам, включая изучение кредитных договоров, договоров обеспечения, анализ методологии создания специальных резервов, оценки финансового состояния заемщиков и выявления признаков негативной информации.

Наши аудиторские процедуры включали в себя пересчет резервов по индивидуально существенным кредитам, а также кредитам, имеющим повышенный кредитный риск. Мы провели анализ финансового состояния заемщиков, признаков негативной информации, наличия просроченной и реструктуризированной задолженности, ожидаемых будущих денежных потоков, обеспеченности задолженности по кредитам, в том числе стоимости реализуемого залога на основании результатов независимой оценки, внутренней оценки Банка и нашего профессионального суждения.

Мы проанализировали последовательность суждений руководства, применяемых при классификации задолженности по кредитам по группам риска.

Мы проанализировали информацию по специальным резервам на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам, раскрытую в примечаниях к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

***Обязанности аудируемого лица по подготовке годовой финансовой отчетности***

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке годовой финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в годовой финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки годовой финансовой отчетности аудируемого лица.

***Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности***

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей годовой финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

• выявляем и оцениваем риски существенного искажения отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

• получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;

• оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в годовой финансовой отчетности;

• оцениваем правильность применения руководством аудируемомго лица допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

• оцениваем общее представление годовой финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли годовая финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Лащенко Павел Анатольевич
Генеральный директор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах № 8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 16 октября 2017 года).

Станкевич Иван Вячеславович
Директор по аудиту

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0002137 от 2 октября 2013 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах № 74 от 15 января 2014 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 9 декабря 2019 года).

Коршун Александр Иванович
Заместитель
начальника отдела аудита

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0002271 от 3 апреля 2015 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах № 105 от 11 января 2018 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 22 декабря 2017 года).

17 марта 2020 года.

**Сведения об аудируемом лице**

Наименование: открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк».
Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 1995 года, регистрационный № 56.
Местонахождение: 220089, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18.

**Сведения об аудиторской организации**

Наименование: общество с ограниченной ответственностью «Эрнст энд Янг».
Свидетельство о государственной регистрации № 190616051, выданное Минским городским исполнительным комитетом 15 декабря 2014 года.
Является членом Аудиторской палаты с 26 декабря 2019 года.
Регистрационный номер записи аудиторской организации в аудиторском реестре — 10051, дата включения в аудиторский реестр — 1 января 2020 года.
Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Клары Цеткин, 51а, 15-й этаж.

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «БПС Сбербанк», 220005, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**

**Лот № 1 – Здание банка** (здание специализированное финансового назначения), общей площадью 2792,6 кв. м, инвентарный номер 252/С-10015, по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Олимпийская, 11А. Составные части и принадлежности: подвал, бокс для выгрузки ценностей.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания банка общей площадью 0,5854 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 2 023 427,45 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 2 – Расчетно-кассовый** центр (здание административно-хозяйственное) общей площадью 287 кв. м, инвентарный номер 342/С-10612, по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, рп Сосновый Бор, ул. Железнодорожная, д. 5а.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания расчетно-кассового центра общей площадью 0,0326 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 31 401,60 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 3 – Встроенно-пристроенное здание** (помещение финансового назначения) общей площадью 1011,8 кв. м, инвентарный номер 252/D-87774, по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Олимпийская, 11-390

| Начальная цена с НДС 20 % | 449 188,42 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 4 – Магазин № 48** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 2058,6 кв. м, инвентарный номер 100/С-1609, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Янки Купалы, 50А. Составные части и принадлежности: навес, металлическое ограждение, гараж, забор, ворота, площадка автотранспорта.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания магазинов общей площадью 0,2310 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 1 952 721,86 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 5 – Банк** (здание специализированное финансового назначения), общей площадью 2181,7, инвентарный номер 350/С-44423, по адресу: г. Гомель, ул. Якуба Коласа, 6А.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации административного здания общей площадью 0,1571 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 1 029 390,12 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 6 – Административное помещение** (административное помещение) общей площадью 179 кв. м, инвентарный номер 300/D-6285, по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, 6А

| Начальная цена с НДС 20 % | 185 914,09 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 7 – Здание банка** (здание административно-хозяйственное) общей площадью 1672 кв. м, инвентарный номер 342/С-125304, по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Ленина, 49А. Составные части и принадлежности: крыльцо.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и содержания здания банка отделения в г. Светлогорске общей площадью 0,3753 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 700 817,11 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 8 – Магазин** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 1176,8 кв. м, инвентарный номер 500/С-22967, по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 19Б/5.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля 131/625) для реконструкции существующих зданий и сооружений под торговые павильоны и строительство новых зданий, сооружений и торговых павильонов рынка по продаже строительных, электротехнических, сантехнических материалов и оборудования общей площадью 7,7627 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 2 056 700,66 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 9 – Одноэтажное кирпичное здание магазина № 8** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 522,4, инвентарный номер 300/С-3129, по адресу: г. Гомель, ул. Чечерская, 3А. Составные части и принадлежности: подвал.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации магазина № 8 общей площадью 0,0600 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 420 074,35 белорусского рубля |
|---|---|

**Лот № 10 – имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Клинокский с/с, п. Озерный, в следующем составе:**
- **База отдыха** (здание многофункциональное) общей площадью 2089 кв. м, инвентарный номер 615/С-266. Составные части и принадлежности: подвал (А3/к), беседки (1, 2, 3).
- **Овощехранилище** (здание нежилое) общей площадью 85,5 кв. м, инвентарный номер 615/С-1382.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания многофункционального здания общей площадью 2,0312 га.
- **Здание зимовника для пчел** (здание специализированное сельскохозяйственного назначения) общей площадью 44,5 кв. м, инвентарный номер 615/С-27933. Составные части и принадлежности: пристройка.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания обслуживания пчелопасеки общей площадью 0,1538 га.
- **Санитарно-обмывочный пункт на 10 мест на базе отдыха ОАО «Белпромстройбанк»** (здание специализированное для бытового обслуживания населения) общей площадью 249,8 кв. м, инвентарный номер 615/С-29048. Составные части и принадлежности: две пристройки.
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для ведения подсобного хозяйства общей площадью 0,5867 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 1 223 428,19 белорусского рубля |
|---|---|

**Дополнительная информация по лотам №№ 1, 2, 3, 5, 7, 10:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by

**Обременения по лотам №№ 1, 3, 4, 5, 6, 7, 8 – аренда. Подробная информация на сайтах www.cpo.by и www.ipmtorgi.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 0,1 до 3% от цены продажи лота

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 29.02.2020 г.

| | |
|---|---|
| Дата и время начала и окончания электронных торгов | **Начало торгов: 10.00 22.04.2020 г. Окончание торгов: 12.00 22.04.2020 г. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов** |
| Дата и время окончания приема заявок | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.04.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| Контактные телефоны | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «БПС Сбербанк», 220005, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**

**Магазин** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 328,4 кв. м, инвентарный номер 400/С-44411, по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, б-р Ленинского Комсомола, 14/1. Составные части и принадлежности: три пристройки (В1/бл, Г1/бл, Д1/бл), электрощитовая (Е1/бл), тамбур (1), покрытие из цементной плитки (лит.Б), покрытие асфальтобетонное (лит.В).
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания магазина № 29 («Зорька») общей площадью 0,0697 га

| Начальная цена с НДС 20 % | 694 677,12 белорусского рубля |
|---|---|

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 0,1 до 3% от цены продажи лота

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Дата и время начала и окончания электронных торгов | **Начало торгов: 10.00 12.05.2020 г. Окончание торгов: 12.00 12.05.2020 г. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов** |
| Дата и время окончания приема заявок | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.05.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| Контактные телефоны | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

Пасля спорту

# «Цырка, роўнага дзю Салей, у свеце няма»

## Як беларус пасля кар'еры спартсмена адправіўся выступаць у найлепшае шоу планеты

**Акрабаты, гімнасты і скакуны на батуце часта ў якасці працягу сваёй кар'еры выбіраюць цыркавую арэну. Прыемна адзначыць, што нашы суайчыннікі запатрабаваны ў найлепшых сусветных шоу і выступаюць практычна на ўсіх кантынентах планеты. Ураджэнец Брэста Дзмітрый ДАРАШУК, дасягнуўшы свайго максімуму ў выступленнях на акрабатычнай дарожцы, атрымаў запрашэнне ад вядомага цырка дзю Салей. Пра сваю работу ў ЗША і Тайвані ён расказаў у інтэрв'ю чытачам «Звязды».**



### «Пра такую прапанову я марыў»

Са спартыўнай кар'ерай Дзмітрый Дарашук вырашыў развітацца ў 2016 годзе. Да таго моманту ён ужо меў званне майстра спорту міжнароднага класа, выйграў бронзавы медаль чэмпіянату свету, а таксама стаў уладальнікам Кубка свету. Пасля гучных поспехаў і ўдалай спартыўнай кар'еры на Дзмітрыя выйшлі менеджары цырка дзю Салей і прапанавалі работу ў ЗША. Для сусветна вядомага канадскага шоу сачыць за спартсменамі з такіх відаў спорту, як акрабатыка, спартыўная гімнастыка, скачкі на батуце і акрабатычная дарожка, падбіраючы для работы ў цырку новых кандыдатаў, — звычайная практыка.

— На той момант мне было 27 гадоў, — успамінае Дзмітрый. — У спорце я дасягнуў практычна ўсяго, чаго хацеў. Да гэтага часу якраз з'явілася сям'я, таму трэба было жыць ужо неяк па-іншаму. Не схаваю, што пра такую прапанову ад дзю Салей я марыў заўсёды, пасля завяршэння спартыўнай кар'еры іншай працы для сябе і не разглядаў, але ўсё ж спачатку хацеў выступіць на чэмпіянаце Еўропы, а потым ужо прыступіць да работы ў цырку, пра гэта і паведаміў менеджарам.

У цырку дзю Салей ёсць своеасаблівы кастынг: ты здымаеш свае здольнасці на відэа і адпраўляеш менеджарам, пасля чаго яны вырашаюць, ці падыходзіць спартсмен пад іх патрабаванні.

— Падрыхтоўка да шоу ў мяне заняла каля двух-трох тыдняў, — я не толькі трэніраваў скачкі, але і вучыўся правільна наносіць макіяж, у той час вельмі шмат чаго даведаўся пра касметыку, — смяецца артыст. — Таксама займаўся харэаграфіяй і толькі пасля гэтага прыступіў да работы ў шоу.

— У дзю Салей ёсць акцёры, на якіх кладзецца большая частка артыстычнай нагрузкі, — тлумачыць Дзмітрый. — Ад нас жа асаблівага артыстызму не патрабавалі, але нейкім азам гэтага майстэрства ўсё роўна навучалі, каб спартсмены не вылучаліся з усяго калектыву. Вядома, выступленні ў цырку адрозніваюцца ад прафесійнага спорту, але не сказаў бы, што такая змена дзейнасці далася мне складана. Усяму можна навучыцца. Першы час трэніроўкі праходзілі штодня, потым абавязковыя заняткі былі дзесьці тры разы на тыдзень. Гэта была вельмі цікавая работа.

У стацыянарным цырку ў Арланда беларус прапрацаваў каля двух гадоў, у шоу ён быў задзейнічаны ў розных нумарах.

— Самым складаным там для мяне была аднастайнасць — усё ж такі ты робіш пастаянна адно і тое ж, а ў спорце ўвесь час нешта мяняецца.

На той момант, калі ў дзю Салей працаваў Дзмітрый Дарашук, ён быў адзіны беларус у шоу. Разам з ім выступала шмат артыстаў з Расіі, Украіны, Казахстана, былі і еўрапейцы, ураджэнцы Францыі, Англіі і іншых краін.

— Спартсмены-славяне запатрабаваныя там, таму што вылучаюцца сваёй добрасумленнасцю, працаздольнасцю, ды і плаціць замежнікам можна значна менш, чым мясцовым, — не хавае Дзмітрый. — Нягледзячы на гэта, для нас цырк — гэта заўсёды добрая магчымасць зарабіць нядрэнныя грошы.

### «Мяжа надыходзіць у 25 гадоў, для кагосьці — у 40»

— Ніякіх узроставых абмежаванняў для спартсменаў у цырку няма, — адзначае Дзмітрый. — Пакуль можаш, датуль і скачаш. Для кагосьці мяжа надыходзіць у 25 гадоў, для кагосьці — у 40.

Усе шоу цырка дзю Салей набылі сваю папулярнасць у тым ліку за кошт прыгажосці і небяспечнасці выступлення артыстаў. Нумары досыць рызыкоўныя, таму часта сустракаюцца і траўмы. Часам шоу заканчваюцца трагедыяй, але такіх гісторый няшмат.

— Вядома, бывала, што я атрымліваў траўмы, былі падзенні, як падчас трэніровак, так і ў ходзе шоу. Бачыў таксама, як траўміруюцца калегі. Здаецца, ты прыходзіш туды са спорту і павінен быць гатовы да пашкоджанняў, але да гэтага проста немагчыма прывыкнуць. Да траўмаў нармальна ставяцца як спартсмены, так і кіраўніцтва цырка, усе разумеюць рызыку. У кожнага артыста ёсць страхоўка, таму ў выпадку траўмы яго лечаць, аднаўляюць і вяртаюць да работы. У камандзе цырка акрамя артыстаў і спартсменаў ёсць фізіятэрапеўты, масажысты і ўрачы, якія пры неабходнасці прыходзяць нам на дапамогу.

Пасля 19 гадоў свайго існавання шоу ў Арланда скончылася. Разам з ім скончыўся і кантракт Дзмітрыя, новы яму не прапанавалі, таму беларус вырашыў вярнуцца на радзіму і пачаў займацца трэнерскай дзейнасцю.

— Сам я родам з Брэста, а жонка з Магілёва, таму вырашылі адправіцца туды. Уладкаваўся працаваць трэнерам у адну са спартыўных школ. У мяне былі групы розных узростаў. З маленькімі працаваць, вядома, найбольш складана, са старэйшымі цікавей, таму што ўжо можаш навучыць іх элементам, якія ведаеш сам. Дзякуючы рабоце ў цырку я ўмею рабіць трэніроўкі больш цікавымі, разнастайнымі, даваць дзецям нейкія новыя веды. Акрабатычная дарожка, напэўна, не такі папулярны від спорту, як тыя ж скачкі на батуце, але ўсё роўна бацькі прыводзілі дзяцей з задавальненнем.

Нягледзячы на тое што трэнерскага вопыту да гэтага ў Дзмітрыя не было, пераезд у Беларусь і змена работы зноў жа даліся яму проста.

— Я ж 20 гадоў у спорце, мне ён вельмі падабаўся. Атрымаў адукацыю трэнера, калісьці хацеў паспрабаваць сябе ў гэтай ролі і, упэўнены, у будучыні вярнуся да трэнерскай работы.

### «Яшчэ мару трапіць у найлепшыя сусветныя шоу»

Прапрацаваўшы ў Магілёве паўтара года, Дзмітрый зноў атрымаў прапанову вярнуцца ў цырк, але ўжо не ў ЗША, а ў Тайвань. Беларус працуе там ужо на працягу пяці месяцаў, паказваючы акрабатычныя трукі.

— Спачатку было шмат сумненняў, ці з'язджаць зноў, але калі я працаваў трэнерам, адчуваў, што не хапае спартыўных эмоцый — адрэналіну, экстрыму, якія былі на працягу ўсяго майго жыцця. Хочацца зноў іх адчуць. Паколькі паўтара года я не практыкаваўся, вярнуцца ў акрабатыку было складана, у першую чаргу псіхалагічна, але праз месяц зноў увайшоў у смак і цяпер не шкадую, што вярнуўся ў гэтую сферу. Цырк, дзе я выступаю, знаходзіцца ў парку, у замку, яго шоу складаецца з розных музычных і акрабатычных нумароў. Гэты цырк, вядома, больш разлічаны на турыстаў вострава.

Кантракт Дзмітрыя падпісаны на год, але калі кіраўніцтва прапануе яму застацца, былы спартсмен, хутчэй за ўсё, пагодзіцца.

— Хоць, вядома, я мару трапіць у найлепшыя сусветныя шоу, вярнуцца ў цырк дзю Салей або выступаць у былога яго рэжысёра Франка Драгона. Цырк, у якім я працаваў у ЗША, і цырк, у якім працую цяпер, — гэта зусім розныя рэчы. Адрозненні датычацца як саміх шоу-праграм, так і ўмоў, якія ствараюць работнікам у звычайным жыцці, заробкаў. Аплата ў цырку звычайна залежыць ад майстэрства артыста, ад яго стажу, з кожным годам яна расце. Але наогул цырка, роўнага дзю Салей, у свеце няма. У ЗША на шоу заўсёды прыходзіла шмат людзей, зала там апладзіруе артыстам стоячы, тут такога я пакуль не бачыў. Вельмі шмат народу было толькі падчас кітайскага Новага года.

Напрыканцы Дзмітрый адзначае, што сёння паспрабаваць сябе на цыркавых памостах хацелі б многія былыя спартсмены...

— І я, безумоўна, параіў бы ім зрабіць гэта. З аднаго боку, у цырку мы працягваем тое, чаму вучыліся ўсё жыццё, паказваем тое, што ўжо ўмеем, але, з іншага боку, для кожнага з нас — гэта новы этап і новы вопыт.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва героя.**

Спытайце пра радзіннае

# Якая розніца паміж маладымі галінкамі і старой вярбой?

**«У нядзелю будзем святкаваць Вербніцу. Чаму менавіта галінкі вярбы панясуць у царкву асвячаць? І як гэта стасуецца з тым, што да самога дрэва, асабліва старога, старэйшыя людзі ставяцца з насцярожанасцю?» — пытаецца Наталля Антонаўна з Мазыра.**

Варта заўважыць, што ў народнай культуры славян гэтае дрэва мела дваістую характарыстыку. Вярба стала сімвалам хуткага росту, набіраючага моц жыцця, урадлівасці, добрага здароўя. Да маладой вярбы ставіліся як да карыснага і свяшчэннага дрэва, галінкі яе неслі ў храм, каб асвяціць. Пры дапамозе лазы ці галінак вярбы на падвор'і адшуквалі ваду, каб выкапаць калодзеж.

Усходнія славяне ўшаноўвалі вярбу за тыдзень да Вялікадня — у Вербную нядзелю, якая і атрымала назву Вербніца. Асноўнай абрадавай падзеяй Вербнай нядзелі стала наведванне царквы з мэтай асвяціць галінкі вярбы, якім беларусы прыпісвалі шматлікія магічна-аздараўленчыя ўласцівасці. Звычай асвячаць галінкі вярбы вядомы са старажытных часоў. Дрэва, якое раней за іншыя адгукаецца на веснавое цяпло, на прабуджэнне зямлі, павінна перадаць сваю моц, здароўе, прыгажосць чалавеку і хатнім жывёлам.

Галінкі вярбы рыхтавалі загадзя: іх выразалі з кустоў, што раслі паабапал рэк і балот, звязвалі ў пучкі па тры ці пяць і ўпрыгожвалі кветачкамі з каляровай паперы або нават кветкамі, спецыяльна нарыхтаванымі і засушанымі з лета, а таксама рознакаляровымі стужкамі. У некаторых рэгіёнах у гэты «букет» дабаўлялі галінку ядлоўцу. Этнографамі былі зафіксаваны звесткі, што яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя ў Гродзенскай губерні ў царкву для асвячэння прывозілі нават вялікую вярбу разам з карэннем. Пасля заканчэння набажэнства яе галінкі ламалі і разносілі па хатах.

Той, хто прыносіў дадому асвячоныя галінкі, злёгку сцёбаў імі ўсіх дамачадцаў, перш за ўсё дзетак, і прыгаворваў:

*Не я б'ю, вярба б'е,*
*За тыдзень — Вялікдзень.*
*Хвора ў лес на верас,*
*А здароўе ў косці!*

* * *

*Не я б'ю, вярба б'е,*
*За тыдзень — Вялікдзень,*
*Будзь здароў як вада,*
*А расці як вярба!*
*Будзь здароў на ўвесь год!*

* * *

У гэты святочны дзень забаранялася працаваць. У кожнай хаце накрывалі стол, запрашалі суседзяў, родзічаў у госці. І хоць ежа на стале была посная, гэта не змяншала агульнай радасці і весялосці. Дзеці бавіліся на вуліцы: цэлы дзень яны гулялі ў даганялкі і лупцавалі адно аднаго вербачкай. Для моладзі перадшлюбнага ўзросту гэты дзень быў яшчэ адной магчымасцю выказаць свае зацікаўленыя адносіны да каханага чалавека.

А вось сярод заходніх славян лічылі, што вярба атрымлівае большую цудадзейнасць не перад Вялікаднем, а на Юр'я. Менавіта ў гэты дзень дзяўчаты плялі з вярбы вянкі і прыгаворвалі: «Каб дабрабыт у хаце рос, як вярба вясной». У сербаў існавала павер'е: калі на Юр'я дзяўчына спляце з маладых галінак вярбы пояс і будзе яго насіць некалькі дзён, то абавязкова ў гэтым годзе выйдзе замуж і будзе «з пузам» (па памерах пояса). Там жа існаваў звычай плесці «пояс» з маладой вярбы на даёнку, «каб малако заўсёды прыбывала». На Валыні і Падоллі моладзь вадзіла карагоды вакол вярбы, прыбранай кветкамі і стужкамі, у купальскую ноч.

А вось старое дрэва вярбы заўсёды выклікала асцярогу, бо лічылася, што месца, дзе расце тое дрэва, дрэннае, бо там жывуць вадзянікі і іншыя нячысцікі. Лічылася таксама, што калі вярба састарэе і ў ствале атрымаецца дупло, там абавязкова паселіцца чорт са сваёй жонкай. Нездарма казалі пра тых, хто моцна закахаўся: «Улюбіўся як чорт у сухую вярбу».

Паколькі вярба расце каля вады і выконвае ролю сімвалічнай мяжы паміж зямной і воднай прасторамі, гэтае дрэва забаранялася садзіць каля дома, у садзе.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

***Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый ды абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».***

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ШТО МОЖНА ПАСАДЗІЦЬ У КРАСАВІКУ Ў АДКРЫТЫ ГРУНТ?

**Рэдзька і радыска.** Для пасадкі гэтых ранніх культур будзе дастаткова, калі глеба прагрэецца да +2 градусаў. Іх садзяць некалькі разоў за вясну-лета пачынаючы з сярэдзіны або канца красавіка. Наступныя градкі радыскі і рэдзькі



трэба саджаць, калі на папярэдніх з'яўляюцца падрослыя ўсходы.

**Шчаўе, кроп, салата і сельдэрэй.** Гэтым непатрабавальным відам салатнай зеляніны не страшныя вясновыя перапады тэмператур. Таму, як толькі глеба на ўчастку дасягне тэмпературы +4 градусы, можна смела высейваць іх насенне або расаду ў грунт.

**Морква.** Гэты караняплод прынята саджаць, калі зямля набярэ больш цяпла (+5-8 градусаў). Для пасадкі морквы лепш выбраць сонечныя адкрытыя ўчасткі, бо яна мае патрэбу ў цяпле і сонечным святле.

Таксама ў красавіку смела можна саджаць **бабы, гарох, шпінат, насенне безрасаднай капусты** пры ўмове, што глеба дастаткова прагрэлася.

# АСНОЎНЫ ДОГЛЯД КЛУБНІЦ

**Каб улетку ўдосталь ласавацца буйнымі духмянымі клубніцамі, вясной варта надаць ім трохі клопату і ўвагі.**

**1.** Агледзьце клубнічную градку. Калі некаторыя расліны загінулі (няма ні адной жывой пупышкі) — выдаліце іх. Калі нейкія кусты выціснула наверх, заглыбце іх, але акуратна, каб «сэрцайка» (цэнтральная пупышка) не апынулася пад зямлёй.

**2.** Абрэжце секатарам усе карычневыя лісты і спаліце іх. Не варта выкарыстоўваць пры гэтым граблі (ні звычайныя, ні веерныя) — выпадкова можна вырваць кусты, дрэнна ўкаранёныя.

**3.** Раскідайце на градцы мінеральныя ўгнаенні з разліку 50 г / кв. м. Выкарыстоўвайце спецыялізаваныя ўгнаенні для клубніц або комплексныя (нітрафоскі). Можна выкарыстоўваць паасобку карбамід (50 г / кв. м), двайны суперфасфат (40 г / кв. м) і калійную салетру (або сульфат калію) — 30 г / кв. м.

**4.** Падрыхліце асцярожна матыкай самы верхні пласт глебы, памятаючы пра тое, што ў клубніц паверхневае размяшчэнне каранёў і іх лёгка пашкодзіць. Адначасова вы закапаеце мінеральныя ўгнаенні ўглыб глебы.

**5.** Замульчыруйце градку кампостам або перагноем (на 2-3 см), не засыпаючы пры гэтым «сэрцайкі» кустоў.

Не ўкладвайце саламяны подсціл адразу на пачатку вясны, таму што ён моцна запаволіць праграванне глебы і затрымае ўраджай.



**6.** Старанна апырскайце ягадныя кусты растворам прэпарату ад мучністай расы. Адначасова ў раствор можна дадаць любы прэпарат супраць кляшча. Пры апрацоўцы старайцеся трапіць саставам на ўнутраную паверхню лісця і на зямлю пад кустамі.

**7.** У якасці альтэрнатывы спецыялізаваным сродкам можна выкарыстоўваць раствор марганцоўкі ў кіпені. Робяць насычана-ружовы раствор і пераліваюць яго ў палівачку. Падрыхтаванай вадкасцю праліваюць (абавязкова праз рассякальнік палівачкі) кусцікі і глебу вакол.

Не хвалюйцеся, што расліна будзе абварана. Прайшоўшы праз пераліў у палівачку і датыкаючыся з ранішнім халадком, кіпень астудзіцца якраз да патрэбных клубніцам 65 °C.

**8.** Калі стаіць сухое надвор'е, добра праліце градку.

**9.** Мульча з саломы — самая лепшая. У пачатку мая (ці ў сярэдзіне — у залежнасці ад надвор'я), калі зямля прагрэецца, выкладзіце на градкі подсціл з саломы ці падсушанай газоннай травы ў якасці мульчы.

**10.** Не забывайце шчодра паліваць плантацыю з клубніцамі, яны вельмі дрэнна пераносяць засуху.

**11.** У сярэдзіне мая апрацуйце ягадныя кусты прэпаратам для прафілактыкі гніляў. Паўтарыце апрацоўку ў пачатку чэрвеня.

### Звярніце ўвагу

**Градку можна замульчыраваць чорным укрыўным матэрыялам, зрабіўшы ў ім прарэзы для кустоў. Аднак майце на ўвазе, што адначасова трэба прымаць меры па барацьбе з мурашкамі, якія ахвотна пасяляюцца пад хованкай.**

Даты | Падзеі | Людзі

**8 КРАСАВІКА**

**У краіне**

**1831** год — заснавана Мінскае генерал-губернатарства, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Расійскай імперыі з цэнтрам у Мінску. Дзейнічала да 1834 года.

**1918** год — у Беларусі ў адпаведнасці з дэкрэтам Саўнаркама былі заснаваны ваенныя камісарыяты.

**1931** год — у калгасе «Чырвоная Полаччына» Ушацкага раёна выйшаў першы нумар газеты «Ударнік» — адной з першых у Беларусі сельскіх шматтыражных газет.

**1950** год — нарадзілася Галіна Рыгораўна Санько, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук (2001), прафесар (2005). Аўтар навуковых прац па праблемах канкурэнцыі, антыманапольнага рэгулявання, транснацыяналізацыі вытворчасці і капіталу, міжнародных эканамічных адносін.



**У свеце**

**1795** год — нарадзіўся Уладзімір Федасеевіч Раеўскі, рускі паэт, публіцыст, дзекабрыст.

**1920** год — дэкрэтам УЦВК заснавана новая баявая ўзнагарода — ганаровая рэвалюцыйная зброя. Першапачаткова яна ўяўляла сабой шашку (корцік) з ордэнам Чырвонага Сцяга, потым з'явілася і агнястрэльная ганаровая зброя — маўзер. Усяго гэтай узнагароды былі ўдастоены 21 чалавек, апошняга ўзнагародзілі Сцяпана Вастрацова ў 1930 годзе.

**1960** год — астраном Фрэнк Дрэйк прыступіў да рэалізацыі эксперымента «Праект «Озма», які стаў пачаткам планамернага навуковага пошуку цывілізацый за межамі Сонечнай сістэмы і перарос у сусветна вядомую праграму пошуку пазаземнага розуму.

**1971** год — у Лондане пачаўся І кангрэс Міжнароднага саюза цыганоў, які ўстанавіў Міжнародны дзень цыганоў.

**Так гаварыў...**

**ПЯТРУСЬ БРОЎКА:**
*Нават страціўшы зрок,*
*Абыду я паўсвету,*
*А да родных мясцін*
*Шлях заўсёды знайду.*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.24 | 19.59 | 13.35 |
| Віцебск | 6.12 | 19.51 | 13.39 |
| Магілёў | 6.15 | 19.49 | 13.34 |
| Гомель | 6.14 | 19.43 | 13.29 |
| Гродна | 6.40 | 20.14 | 13.34 |
| Брэст | 6.43 | 20.12 | 13.29 |

**Месяц**

***Поўня ў 5.34.***
***Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

**Імяніны**

***Пр.** Авраама, Алы, Васілія, Ганны, Гаўрыіла, Ібрагіма, Ларысы, Праскоўі, Сцяпана.*
***К.** Юлія, Дзіянісій.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

Аднойчы я злавіў такую велізарную рыбу, што давялося яе адпусціць. Усё роўна ніхто не паверыў бы.

**Госпадзе, дапамажы мне зрабіць з дзіцем урокі і застацца пры гэтым любячай матуляй, культурнай жанчынай і адэкватнай суседкай.**

Калі дзяўчына нерэальнай прыгажосці любіць цябе да вар'яцтва, лашчыць, цалуе і песціць, то, хутчэй за ўсё, ты — шпіц.

**Пачуты ў аўтобусе абрывак гутаркі дзвюх дзяўчат:**
**— Блін, як надакучылі гэтыя дыеты, фітнес, салоны... Хутчэй бы ўжо замуж выйсці!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1279.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 7 красавіка 2020 года.